Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

28 САКАВІКА 2023 г. АЎТОРАК

№ 58 (29938)

ЗВЯЗДА

ЯК ЖЫВЕ «БЕЛАРУСКІ ШААЛІНЬ»? 11

КАЛІ ПРЫЙДЗЕ САПРАЎДНАЕ ЦЯПЛО 12

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«УСЁ ЗАСЯРОДЖАНА Ў ВАШЫХ РУКАХ, БЯРЫЦЕ І ДЗЕЙНІЧАЙЦЕ»

Панядзелак — дзень не цяжкі, а кадравы. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў згоду на назначэнне новых кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, найважнейшых арганізацый, рэспубліканскіх органаў.

Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў кандыдатуру Дзмітрыя Петражыцкага на пасаду першага намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама. Кадравыя перастаноўкі адбыліся ў Мінскаім гарвыканкаме: Надзея Лазарэвіч стала першым намеснікам старшыні, а Аляксандр Чэрнікаў — намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама. Прэзідэнт узгадніў кандыдатуру Сяргея Лабадзінскага на пасаду старшыні Брэсцкага гарвыканкама, а кандыдатуру Аляксандра Горбача — на пасаду старшыні Добрускага райвыканкама. Анатоль Завацкі стаў старшынёй Вілейскага райвыканкама, а Дзмітрый Колас — Уздзенскага райвыканкама. Сяргей Ермаліцкі ўзначаліў Круглянскі райвыканкам, Геворг Мелканян — Хоцімскі, Дзмітрый Акуліч — Чавускі. Кандыдатура Віталя Марозава ўзгоднена на пасаду кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля.

Аляксандр Лукашэнка асобна звярнуўся да Сяргея Лабадзінскага, які раней працаваў кіраўніком спраў Брэсцкага аблвыканкама: «Я так разумею, Сяргей Мікалаевіч, вы чалавек перспектыўны, ведаеце ўсе вузкія месцы, недахопы. І ў Брэсце гэта будзе выпрацўлена?» Новы мэр горада адказаў сцвярджальна. Прэзідэнт папярэдзіў, што летам або восенню плануе наведаць Брэст, каб праверыць, як там наладжана работа ва ўсіх сферах жыццядзейнасці. «Пакуль да Брэсцкай вобласці прэтэнзій увогуле вялікіх няма. Вы, магчыма, нават не горш працуеце, чым іншыя вобласці. Але тым не менш...» — заўважыў ён. Асобна беларускі Прэзідэнт пацікавіўся матывацыяй Сяргея Ермаліцкага, які вырашыў змяніць пасаду старшыні Гомельскага райвыканкама на пасаду кіраўніка Круглянскага райвыканкама. «Магілёўскі рэгіён для мяне — гэта малая радзіма. Хацелася б папрацаваць на Магілёўшчыне», — расцлумачыў Сяргей Ермаліцкі.

Прэзідэнт удзяліў асаблівую ўвагу развіццю Гомельскай вобласці. На нарадзе, якая прайшла ў лістападзе мінулага года ў Гомельскім аблвыканкаме, кіраўніком дзяржавы былі дадзены канкрэтныя даручэнні па развіцці рэгіёна. «Праблемы ведаеш. Адыходзіць няма куды. Гэты год паказальны. Тое, што ты становішся побач з губернатарамі і будзеш несці адказнасць, — гэта добра. Але ты ж разумееш адказнасць? — звярнуўся Прэзідэнт да Дзмітрыя Петражыцкага, які ўзгоднены на пасаду першага намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама. — Далей ужо няма куды. Таму настройвайся адразу разам з Іванам Іванавічам Крупко (губернатарам Гомельскай вобласці. — **Заўв. рэд.**) на ваенны лад і пачынайце разгортваць як след». Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ходам пасяўной кампаніі ў Гомельскай вобласці, зрабіўшы акцэнт на неабходнасці захавання тэхналогій і якаснай падрыхтоўкі глебы для пасеваў. «Калі своечасова цяпер падкорміце, па-сапраўднаму, — будзеце мець ураджай. Не падкорміце — ураджаю не будзе. У гэтым асаблівасць і ўсёй Беларусі — своечасова падкарміць азімыя. Я за некаторымі палямі назіраю. Дзе падкармілі дні 4-5 таму, у гэтыя цёплыя дні, — зялёныя ўсе палі стаяць. І рапс ужо патроху зелянее. Я яшчэ раз настойваю на тым, каб было ваеннае становішча ў гэтым плане. Дзень і ноч трэба працаваць, але своечасова падкарміць», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён таксама заўважыў, што людзей, якія працуюць у сельскай гаспадарцы, днём і ноччу праводзяць пасяўную кампанію, трэба матываваць матэрыяльна.

«Задачы, мужыкі, вы ведаеце. Я неаднойчы пра гэта казаў. Год асаблівы. Нам трэба падрыхтавацца да палітычных кампаній, каб нас не пачалі хістаць чарговы раз», — канстатаваў беларускі лідар. Ён даручыў звярнуць увагу на пытанні, якія ставіць насельніцтва. Але, па словах, кіраўніка дзяржавы, гэта не здымае з людзей абавязкаў самастойна вырашаць жыццёвыя пытанні і не чакаць дапамогі ўлад у дробных бытавых справах. Сярод пытанняў, пра якія павінны дбаць прадстаўнікі ўлады, ён назваў цэнаўтварэнне, пытанні ЖКГ, пытанні сельскай гаспадаркі. «Адзін інвестыцыйны праект — адзін раён — гэта ваша задача. Мы гэтага не забудзем, і перш за ўсё я. Гэта маё асабістае даручэнне кожнаму старшыні райвыканкама. Трэба бегаць хутка па краіне, шукаць інвестараў. Сёлета вы павінны далажыць аб рэалізацыі гэтага праекта. Пры гэтым маштабы праекта павінны залежаць ад рэзерву свабоднай працоўнай сілы ў рэгіёне», — паставіў задачу Прэзідэнт. Па яго словах, у поўні зроку мясцовай улады павінны знаходзіцца і пытанні развіцця вытворчай базы: «Рынкі адкрыты, асабліва вялізны расійскі рынак. Усім трэба варушыцца, не толькі абласной уладзе, але і старшыням гар- і райвыканкамаў. Райвыканкамы ў нас не задзейнічаны ва ўсю моц, яны недагружаны ў гэтым плане. Патрабавальнасць у гэтым ключы будзе толькі ўзрастаць».

СТАР. 3

ВЯСНЯНКІ ВЯСНУ ГУКАЮЦЬ

Кожную вясну напрыканцы сакавіка ў Купалавай Вязынцы адбываецца маляўнічае і святочнае абрадавае дзейства «Гуканне вясны». Вось і ў гэтую нядзелю, якая выдалася надзіва лагоднай і цёплай, Вязынка раскрытнела песнямі-вяснянкамі, папяровымі птушкамі на галінках дрэў, гукамі гармоніка, скрыпкі, цымбалаў і жалейкі, вясёлым гоманам кірмашу народных майстроў і вясёлкавымі колерамі андаракаў і кашуль дзявочых строяў. І гэта была ўжо не стыхійная спеўна-танцавальная тусоўка, а шматгадовая традыцыя, якую ў свой час распачалі і праводзяць філіял літаратурнага музея Янкі Купалы і аб'яднанне энтузіястаў-збіральнікаў аўтэнтычнай культуры «Студэнцкае этнаграфічнае таварыства». Мерапрыемства праводзіцца ў гонар вясновага абуджэння прыроды і вяртання птушак дадому пасля зімы. Спрадвеку гэтае свята называлі «Саракамі». У вёсках у гэтую пару пяклі булачкі (печыва) у выглядзе птушачак і часцівалі дзетак, а дзяўчаты збіраліся за вёскай на высокай горцы і, стаўшы ў кола, якое сімвалізуе сонца, гучна спявалі песні-вяснянкі, каб далёка было чуваць. Вось і ў Вязынцы сёлета таксама гукалі «жавароначкаў» адмысловымі вяснянкамі, а дзіцячы фальклорны гурт «Явар» 159-й мінскай школы пад кіраўніцтвам Святланы Балцэвіч дапамагаў клікаць вясну гукамі гліняных свістулек (*на фота*).

Фота Андрэя ЛІПСКАГА

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ЛЕШЫК, начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча:

«Беларускія аграрыі пачалі ўжо масавую сяўбу яравых культур, выключэнне складаюць толькі Віцебская і Магілёўская вобласці. Найбольш актыўна палявыя работы ідуць у Брэсцкай вобласці, паколькі там на 7—10 дзён раней цяплее. Менавіта гэты рэгіён задае рабочы тэмп у пачатку пасяўной кампаніі. Па стане на 27 сакавіка сяўба ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур (без кукурузы, грэчкі і проса) праведзена на плошчы 49,7 тысячы га, або 7,63 працэнта плана. У Брэсцкай вобласці сяўба праведзена на 29,4 працэнта запланаваных плошчаў, у Гомельскай — на 7,26 працэнта, у Гродзенскай — на 12,8 працэнта, Мінскай — на 0,91 працэнта».

Смачна есці!

Пельмені, шашлычок «Школьны» ці малочны суп?

Недзіцячая задачка — смачна накарміць і прывіць школьнікам здаровыя харчовыя звычкі

«Думаць пра тое, чым харчуецца ваша дзіця ў школе, гэтак жа важна, як і пра тое, якім прадметам яго там вучаць. Правільнае харчаванне значыць не менш, чым добрая адукацыя. Калі да сарака гадоў у вас ужо цэлы букет хвароб, то ніякія веды па трыганаметрыі не дапамогуць», — гэта цытата з кнігі, якую напісала былы школьны шэф-кухар. Сёння ў большасці развітых краін свету пытанне забеспячэння школьнікаў якасным харчаваннем прыраўноўваецца да пытання нацыянальнай бяспекі, у тым ліку і ў Беларусі. Арганізацыя школьнага харчавання традыцыйна знаходзіцца пад пільным кантролем беларускага урада, Камітэта дзяржкантролю, міністэрстваў адукацыі, аховы здароўя і санітарнай службы.

НАВУКОВЫ ПАДЫХОД

У снежні мінулага года ў Беларусі стартаваў пілотны праект па арганізацыі харчавання школьнікаў, які ахапіў 21 установу адукацыі: па тры — у кожнай вобласці і тры — у сталіцы. Днямі стала вядома, што **эксперымент будзе прадоўжаны да канца мая і дадаткова ахопіць дзве мінскія пачатковыя школы № 112 і № 29.** У новай рэдакцыі пастановы Савета Міністраў выкладзены эксперыментальныя нормы харчавання, якія складаюцца з разліку колькасці розных груп і відаў прадуктаў (у спісе некалькі дзясяткаў пазіцый) у суткі на аднаго вучня з улікам узросту школьнікаў.

СТАР. 4

Наш фармат

«Беларусь інтэлектуальная» прырастае рэгіёнамі

У Брэсце з поспехам прайшла выстаўка навукова-тэхнічных дасягненняў краіны

З 24 да 26 сакавіка горад над Бугам прымаў выстаўку навукова-тэхнічных дасягненняў «Беларусь інтэлектуальная. Рэгіёны». Асноўную экспазіцыю размясцілі ў лёгкаатлетычным манежы, машыны і механізмы выстраілі ў лінейку на пляцоўцы перад уваходам у спартыўны комплекс.

Дадзеная экспазіцыя стала фінальным акордам урачыстага ходу па краіне навуковых дасягненняў апошняга часу. Выстаўка стартавала ў сталіцы, дзе яе наведала каля 100 тысяч чалавек, а затым з поспехам прайшла ў абласных цэнтрах. У Брэсце форум таксама сабраў шмат гасцей і ўдзельнікаў.

— Брэстчына хоць і аграрны рэгіён, але не адстае ў навуковых і высокатэхналагічных ідэях і распрацоўках, — сказаў, адкрываючы выстаўку, **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** — У нас створаны ўсе ўмовы, каб забяспечыць распрацоўкі, іх выпрабаванне і ўкараненне. З самымі разнастайнымі экспанатамі можна азнаёміцца на выстаўцы. Думаю, яна будзе цікавая моладзі, студэнтам, прадстаўнікам працоўных калектываў, — заўважыў губернатар. — Усім цікава, чым сёння жыве вялікая навука, як здумкі ўвасабляюцца ў жыццё.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэм'ер-міністр Ізраіля плануе прыпыніць судовую рэформу, якая справакавала беспарадкі

Біньямін Нетаньяху заявіў партнёрам па кааліцыі аб прыпыненні судовай рэформы, паведаміла тэлерадыёкампанія KAN. Па звестках журналістаў, галоўны ідэолаг ініцыятывы — міністр юстыцыі Ярыў Левін зразумеў, што «іншага выбару няма». Прапанаваны ўрадам Нетаньяху пакет законаў значна абмяжоўвае паўнамоцтвы Вярхоўнага суда і дае ўраду кантроль над прызначэннем суддзяў. Спецыяльная камісія кнесета адобрыла яго да другога і трэцяга чытанняў. Законапраекты прынятыя ў першым чытанні 15 сакавіка, атрымаў неафіцыйную назву «закон Дэры 2.0» за тое, што патэнцыяльна пракладзе шлях да вяртання былога міністра ўнутраных спраў Ар'е Дэры, адхіленага прэм'ерам пасля адпаведнага рашэння Вярхоўнага суда ў сувязі з папярэднімі судзімасцямі. Пратэсты супраць рэформы не сціхаюць у Ізраілі дванаццаты тыдзень запар. Па ацэнцы мясцовых СМІ, у мінулую нядзелю на вуліцы выйшлі звыш 600 тысяч чалавек. Новую хвалю дэманстрацый справакавала адстаўка кіраўніка ізраільскага Мінабароны Ёава Галанта, ён стаў першым ключавым міністрам урада Нетаньяху, які выступіў супраць прыняцця новых законаў.

Урад Францыі паабяцаў далейшыя непапулярныя рэформы

Афіцыйны прадстаўнік урада Францыі Аліўе Веран заявіў, што выканаўчая ўлада мае намер, апроч пенсійнай рэформы, правядзіць і іншыя непапулярныя, але неабходныя для краіны рэформы. «Пенсійная рэформа не азначае наступлення пенсіі для рэформ. Заўтра будуць іншыя рэформы, якія правядзяцца намі або ўрадамі, якія прыйдуць нам на змену», — адзначыў ён у інтэрв'ю газеце Le Journal du dimanche. У нядзельны палаце парламента — Нацыянальным сходзе — было вылучана два вотумы недавер у сувязі прэм'ер-міністра Элізабэт Борн, але яны не набралі патрэбнай колькасці галасоў. Аліўе Веран зрабіў заяву аб будучых рэформах на фоне масавых пратэстаў у краіне, якія праводзіліся да прынятыя пенсійнай рэформы і працягваюцца пасля яе зацвярджэння. Апошнія акцыя 23 сакавіка, якая сабрала, паводле афіцыйных звестак, звыш мільёна маніфестантаў, вылілася ў буйныя беспарадкі з пагромамі і сутыкненнямі з паліцыяй. На 28 сакавіка прафсаюзы плануюць чарговы агульнанацыянальны дзень пратэсту.

Англійскі сняданак упершыню стаў каштаваць больш чым 35 фунтаў

Кошт традыцыйнага англійскага сняданку ў лютым павялічыўся на 22 працэнты ў параўнанні з тым жа месяцам мінулага года і ўпершыню перавысіў 35 фунтаў стэрлінгаў ($43), сведчаць разлікі агенцтва Bloomberg. Паказчык, які ўлічвае цэны на каўбасу, бекон, яйкі, хлеб, масла, таматы, грыбы, малако, чай і каву, павялічыўся за год на 6 фунтаў. Пры гэтым тэмпы росту перавышаюць 20 працэнтаў ужо другі месяц запар. Усе кампаненты традыцыйнага англійскага сняданку падаражэлі ў гадавым супастаўленні, у тым ліку малако на 43 працэнты, хлеб і яйкі — на 33 працэнты. У лютым адносна папярэдняга месяца мацней за ўсё падаражэў хлеб (на 6,9 %), памідоры (на 6,4 %) і каўбасы (на 6,3 %). На фоне дэфіцыту агародніны агульны ўзровень інфляцыі ў Вялікабрытаніі павысіўся ў лютым да 10,4 працэнта з 10,1 працэнта ў папярэдні месяц. Гэта стала нечаканасцю для аналітыкаў, якія прагназавалі запаволенне тэмпаў росту спажывецкіх цэн ніжэй за 10 %.

КАРОТКА

- Масавая сяўба ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур пачалася ў Беларусі.

- **Польшча стварыла транспартны калапс: перад «Кукурыкамі» сабралася тысяча фур.**
- Пасольства Зімбабвэ пачынае афіцыйную работу ў Беларусі.
- **ДАІ — бацькам: не пакідайце ключы ад аўто ў свабодным доступе і кантралюйце адпачынак дзяцей.**
- «Культурнай сталіцай года» ў 2024-м стануць Бялынічы.

ISSN 1990 - 763X

ЯРКІЯ ФАРБЫ КНІЖНАГА КІРМАШУ

За дні правядзення форум наведала больш за 50 тысяч чалавек

У гэтую нядзелю, 26 сакавіка, завяршылася юбілейная XXX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Апошні раз (прынамсі, сёлета) прывёз радасных і прыемна здзіўленых наведвальнікаў у выставачны цэнтр на праспекце Пераможцаў паэтычны аўтобус. Уручаны апошнія дыпломы, падведзены вынікі... Кніжны форум у чарговы раз стаў падзеяй, і не толькі для нашай краіны, што адбілася ўжо ў лозунгу, пад якім ён праходзіў: «Свет кнігі без межаў». Ганаровым госцем выстаўкі была Расійская Федэрацыя, прайшлі Дні ўзбекскай літаратуры. Паколькі выстаўка адчынілася ў знакавы дзень — 80 гадоў хатынскай трагедыі, шмат увагі было аддадзена тэме вайны, генацыду беларускага народа. Адбыўся традыцыйны міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час», які меў прававакацыйную для дыскусіі назву «Някніжны свет». Узнагародзілі лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу «Мастацтва кнігі»... Дый увогуле кожны дзень быў надзвычай багаты на падзеі. Былі багатыя на іх і апошнія дні выстаўкі, якія выпалі на суботу і нядзелю. Давайце разам перагартаем яркія старонкі гэтых дзён.

СТАР. 12

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь
Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

РАШЭННЕ
КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
14 сакавіка 2023 г. г. Мінск

Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Карповіч Н.А., суддзяў Бодак А.М., Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілоўка С.Я., Козыравай Л.Р., Рабцава В.М., Рабцава Л.М., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П., разгледзеўшы ў судовым пасяджэнні пытанне аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь,

кіруючыся артыкуламі 22 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, артыкуламі 74, 79, 84, 161—163 Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве»,

ВЫРАШЫЎ:

1. Прыняць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь» (дадаецца).

2. Апублікаваць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь» ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

Старшынствуючы —
Старшыня Канстытуцыйнага
Суда Рэспублікі Беларусь П.П.Міклашэвіч
№ P-1304/2023

ПАСЛАННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Дынамічнае развіццё грамадскіх адносін, актуалізацыя праблем міру і грамадзянскай згоды, забеспячэнне нацыянальнай бяспекі, захаванне канстытуцыйнай ідэнтычнасці ўмацаванне суверэнітэту абумовілі праведзенне ў Рэспубліцы Беларусь канстытуцыйных пераўтварэнняў, важнейшым этапам якіх з'явілася прынятае 27 лютага 2022 г. на рэспубліканскім рэферэндуме змяненне і дапаўненне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Абноўленая Канстытуцыя вызначыла сучасныя асновы мадэрнізацыі дзяржавы і грамадства, новыя падыходы да функцыянавання органаў дзяржаўнай улады і грамадска-палітычных інстытутаў з мэтай зацвярджэння прыярытэтаў і свабод чалавека і грамадзяніна, асноў прававой дзяржавы і сацыяльнага справядлівага грамадства.

Канстытуцыйнае замацаванне абазвяку грамадзян Рэспублікі Беларусь па захаванні гістарычнай памяці аб ерачінным мінулым беларускага народа, патрыятызм служаць асновай фарміравання канстытуцыйна арыентаванай прававядамасці асобы, грамадзянскай супольнасці, арыенцірам дзяржаўнай палітыкі па выхаванні ў моладзі пачуцця адказнасці за сучаснасць і будучыню краіны.

Умовамі паўнавартаснага жыццяўмення канстытуцыйных заканнасцей з'яўляюцца пастаўленае і сістэмнае заканадаўчае забеспячэнне механізмаў дасягнення канстытуцыйных мэт, неўхільнае прытрымліванне канстытуцыйнага прынцыпу дзяржаўнай органамі і службовымі асобамі, інстытутамі грамадзянскай супольнасці, палітычнымі партыямі.

Важная роля ў зацвярджэнні сучаснага беларускага канстытуцыяналізму належыць Канстытуцыйнаму Суду Рэспублікі Беларусь, які шляхам акцыялізўлення канстытуцыйнага кантролю ў дзяржаўна-прававым жыцці канстытуцыйнага ладу, прававой і свабод чалавека і грамадзяніна, забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі і яе прамога дзеяння на гаранце канстытуцыйнай бяспеку, садзейнічае ажыццяўленню канстытуцыйнай прынцыпаў, прававарыянтнага і прававзбалансаванага.

Праз канстытуцыйнае правасуддзе змяняецца якасць прававой сістэмы, фарміруецца асаблівы палітыка-прававы розьм судовага забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі, як прававой абароны як акта прамога дзеяння, які гарантуе збалансаванаю рэалізацыю фундаментальных каштоўнасцей і інтарэсаў грамадства ў дэмакратычнай прававой дзяржаве.

I

Абноўленая Канстытуцыя, замацоўваючы такія універсальныя каштоўнасці, як чалавек, яго правы і свабоды, суверэнітэт, незалежнасць, вярхоўства права, сацыяльная справядлівасць, роўнасць усіх перад законам, культурная і духоўная спадчына, вызначае асноўныя вектары, межы і змест неабходнага заканадаўчага рэгулявання.

Вышэйшая юрыдычная сіла Канстытуцыі аказвае непасрэдне рэгулюючае ўздзеянне на грамадскія адносіны, якое выражаецца ў абавязковасці яе палажэнняў для дзяржаўных органаў і службовых асоб, арганізацый і грамадзян, з'яўляецца галоўным крытэрыем нарматворчай і правапрымяняльнай дзейнасці, забеспячэння канстытуцыяналізацыі грамадскіх адносін, дзейнасці канстытуцыйна-прававых механізмаў дзяржавы і свабод грамадзян.

Прамое дзеянне Канстытуцыі на ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дазваляе ажыццяўляць маштабную канстытуцыяналізацыю заканадаўства з мэтай забеспячэння эфектыўнага прававога рэгулявання эканамічнай дзейнасці чалавека, грамадзян і дзяржавы, праз рэалізацыю эместу прынцыпаў і норм Канстытуцыі.

1. Важнейшым крокам развіцця сучаснага беларускага канстытуцыяналізму з'яўляецца здзяканалення поўнаты і якасці прававога рэгулявання ў дзяржаўна-грамадскім жыцці, асноўнай задачай якога з'яўляецца ўдасканаленне існуючых і выпрацоўка новых форм удзелу грамадзян у кіраванні справамі дзяржавы і грамадства. Абноўленая Канстытуцыя прадугледжвае ўнікальную форму ажыццяўлення ўлады народам — Усебеларускі народны сход, які, будучы вышэйшым прадстаўнічым органам народаўладдзя, азначае пераход да сацыяльнай дэмакратыі.

Склад дзеягатаў Усебеларускага народнага сходу, вызначальны законам парадак яго фарміравання дазваляюць у рамках канстытуцыйна-прававога поля ўлічваць голас і волю ўсяго народа, прымаць на самым высокім узроўні адзінае рашэнне, якое з'яўляецца абавязковым для выканання ўсімі дзяржаўнымі органамі.

Канстытуцыйна-ўладныя паўнамоцтвы Усебеларускага народнага сходу накіраваны на рэалізацыю стабілізацыйнай, кансалідуючай, праграмна-стратэгічнай і рэгулюючай функцый дзяржавы, аб'яднання і згуртавання грамадска-палітычных сіл у краіне, дасягненне грамадзянскай згоды па важнейшых пытаннях дзяржаўнага і грамадскага жыцця.

Абноўленай Канстытуцыяй прадугледжана ўмацаванне ролі і умацаванне незалежнасці судовай улады як самастойнай галіны дзяржаўнай улады, якая ажыццяўляе функцыю правасуддзя праз вырашэнне судовых спраў ва ўстаноўленай законам працэсуальнай форме.

У гэтых мэтах зменяннямі і дапаўненнямі Канстытуцыі замацаваны статус Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь як органа, што ўзначальвае сістэму судоў у дачыненні юрысдыкцыі і з'яўляецца вышэйшым судовым органам, які ажыццяўляе правасуддзе праз грамадзянскую, крымінальную і іншыя формы судаводства, прадугледжаныя законам; устаноўлены новы парадак фарміравання Вярхоўнага і Канстытуцыйнага судоў.

Істотна пашыраны паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда па ажыццяўленні канстытуцыйнага кантролю нарматыўных прававых актаў у дзяржаве, ашчыненне да свабоды і справядлівасці, міралюбівы характар, сілу і працягтанне беларускай дзяржавы, а таксама прыхажосць і ўнікальнасць прыроды Беларусі; рэалізацыя палажэнняў Канстытуцыі у Закона «О государственных символах Республики Беларусь» садзейнічае выхаванню ў вучняў устаноў адукацыі і іншых грамадзян пачуцця патрыятызму і грамадзянскасці, гонару за сваю Айчыну, прывіцяю павагі да гістарычнай памяці, традыцый, нацыянальнай і культурнай самабытнасці беларускага народа (рашэнне ад 26 снежня 2020 г. па Закону Рэспублікі Беларусь «О государственных символах Республики Беларусь»).

Прынцыпавымі абноўленай Канстытуцыі ўстаноўлена, што кожны павінен праяўляць сацыяльную адказнасць, уносіць пасільны ўклад у развіццё грамадства і дзяржавы. Канстытуцыйны абавязак кожнага як унутрана прынятае і добраахвотна абавязацельства перад грамадзянінам накіраваны на ўстанаўленне балансу правоў і абавязкаў, які садзейнічае дасягненню справядлівай раўнавагі памяж інтарэсамі грамадства і неабходнымі ўмовамі абароны правоў і свабод асобы.

Канстытуцыяй прадугледжана, што дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб ерачінным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а захаванне гістарычнай памяці аб ерачінным мінулым беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Згодна з прававой пазіцыяй Канстытуцыйнага Суда, заканадаўчае прызнанне з'явамі фактаў гераізму беларускага народа адлавядае палажэнням Канстытуцыі, замацуе ў гістарычнай памяці народа справядлівую ацэнку злачынстваў фашысты і іх памагатых на беларускай зямлі, спрыяе гістарычнай памяці нашчадкаў мільёнам ахвяр фашызму, а таксама будзе мець важнае канстытуцыйна-прававое і палітычнае значэнне (рашэнне ад 29 снежня 2021 г. па Закону Рэспублікі Беларусь «О геноциде белорусского народа»).

Абноўленая Канстытуцыя, замацоўваючы важнейшыя мэты і каштоўнасці грамадства і дзяржавы, з'яўляецца дзейсным інструментам фарміравання прававой культуры грамадзян. Праз канстытуцыйнае замацаванне ў тэксце Канстытуцыі ажыццяўляюцца самаідэнтыфікацыя чалавека як актыўнага носьбіта прававой і абавязкавай, улашых кожнаму члену грамадзянскай супольнасці, фарміраванне канстытуцыйнага патрыятызму.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што канстытуцыйны патрыятызм прадвызначае павышэнне канстытуцыйнай культуры, уключаючы ўсведамленае прызнанне неабходнасці жыць і дзейнічаць у адпаведнасці з канстытуцыйнымі заканадаўчымі і маральнымі нормамі. Сутнасць канстытуцыйнага патрыятызму заключаецца ў тым, што грамадзяне не толькі праяўляюць любоў і павагу да сваёй Айчыны, народа, яго гісторыі, культуры, маюць гонар за сваю прыналежнасць да Радзімы, але і ўспрымаюць сябе як носьбітаў прававой самасвядомасці, якая ўключае ў сябе ўсведамленае прызнанне і выкананне заканадаўства, якія падлягаюць прымяненню судамі пры разгляданні канкрэтных спраў. Тым самым на Канстытуцыйны Судускладваецца функцыя выяўленняканстытуцыйна-прававога зместу канстытуцыйных прынцыпаў і норм пры прававырашэнні.

Такім чынам, прававарыянтная практыка, якая ажыццяўляецца ў адпаведнасці з канстытуцыйным рэгуляваннем, на аснове здзяканалення заканадаўства ў дачыненні розных відаў прававых поўнаў, адрэзвальсі і эфектыўных сродкаў рэалізацыі канстытуцыйных палажэнняў, дазваляе мінімізаваць рызыкі парушэння канстытуцыйных прынцыпаў і норм, пагроз канстытуцыйнаму прававладарству.

3. Забеспячэнне дзеяння палажэнняў абноўленай Канстытуцыі прадугледжвае наяўнасць высокага ўзроўню прававой культуры. Улічваючы, што дэфармаванае грамадскае думка можа стаць прычынай юрыдычных канфліктаў, прывесці да «нестыкоўкі» патрабаванняў Канстытуцыі і чаканняў грамадства, неабходна пастаяннае растлумачанне канстытуцыйных палажэнняў, рэалізацыя на масавую аўдыторыю з розным узроўнем прафесійнай і агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі, розных поглядаў.

Абавязковай умовай з'яўляецца прадаўжэнне работы па выхаванні грамадзян у духу адказнасці за развіццё канстытуцыйных ідэалаў. Прыцягненне ўвагі насельніцтва да канстытуцыйных пераўтварэнняў здольна забяспечыць не толькі падтрымку грамадзянамі зменненняў і дапаўненняў Асноўнага Закона, але і прыхільнасць да канстытуцыйных каштоўнасцей, садзейнічаючы тым самым далейшаму ўкараненню іх у грамадскую практыку.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што для напаўнення канстытуцыйных прынцыпаў і норм практычным зместам яны павінны быць як адлюстраваны ў заканадаўстве, так і стаць вызначальнай часткай грамадскай прававзаемасці. Пры гэтым не толькі дзяржаўныя органы, службовыя асобы абавязаны дзейнічаць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства, але неабходна, каб і грамадзяне ведалі і паважалі Канстытуцыю, сваімі ўчынкамі не фундаментальныя каштоўнасці і прынцыпы.

Праз фарміраванне канстытуцыйнай правасведамасці ўвасабляюцца ў жыццё асноўныя прынцыпы арганізацыі і жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы, вызначаюцца і падтрымліваюцца ў стабільнасці і захаванні Асноўнага Закона рэалізоўваць свае канстытуцыйныя правы і выконваць абавязкі.

Згодна з Канстытуцыяй сімваламі Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы з'яўляюцца ее Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн.

Канстытуцыйны Суд адзначаў, што ў дзяржаўных сімвалах адлюстроўваюцца гістарычна абумоўленыя светапогляднья пачаткі і цывілізацыйныя моты развіцця народа Беларусі як дзяржаваўтваральнага суб'екта, яго менталітэт, базавыя маральныя імператывы і эстэтычныя перавагі; Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь сімвалізуюць працавітасць беларускага народа, яго талерантасць, мудрасць, імкненне да свабоды і справядлівасці, міралюбівы характар, сілу і працягтанне беларускай дзяржавы, а таксама прыхажосць і ўнікальнасць прыроды Беларусі; рэалізацыя палажэнняў Канстытуцыі у Закона «О государственных символах Республики Беларусь» садзейнічае выхаванню ў вучняў устаноў адукацыі і іншых грамадзян пачуцця патрыятызму і грамадзянскасці, гонару за сваю Айчыну, прывіцяю павагі да гістарычнай памяці, традыцый, нацыянальнай і культурнай самабытнасці беларускага народа (рашэнне ад 26 снежня 2020 г. па Закону Рэспублікі Беларусь «О государственных символах Республики Беларусь»).

Прынцыпавымі абноўленай Канстытуцыі ўстаноўлена, што кожны павінен праяўляць сацыяльную адказнасць, уносіць пасільны ўклад у развіццё грамадства і дзяржавы. Канстытуцыйны абавязак кожнага як унутрана прынятае і добраахвотна абавязацельства перад грамадзянінам накіраваны на ўстанаўленне балансу правоў і абавязкаў, які садзейнічае дасягненню справядлівай раўнавагі памяж інтарэсамі грамадства і неабходнымі ўмовамі абароны правоў і свабод асобы.

Канстытуцыяй прадугледжана, што дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб ерачінным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а захаванне гістарычнай памяці аб ерачінным мінулым беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Згодна з прававой пазіцыяй Канстытуцыйнага Суда, заканадаўчае прызнанне з'явамі фактаў гераізму беларускага народа адлавядае палажэнням Канстытуцыі, замацуе ў гістарычнай памяці народа справядлівую ацэнку злачынстваў фашысты і іх памагатых на беларускай зямлі, спрыяе гістарычнай памяці нашчадкаў мільёнам ахвяр фашызму, а таксама будзе мець важнае канстытуцыйна-прававое і палітычнае значэнне (рашэнне ад 29 снежня 2021 г. па Закону Рэспублікі Беларусь «О геноциде белорусского народа»).

Абноўленая Канстытуцыя, замацоўваючы важнейшыя мэты і каштоўнасці грамадства і дзяржавы, з'яўляецца дзейсным інструментам фарміравання прававой культуры грамадзян. Праз канстытуцыйнае замацаванне ў тэксце Канстытуцыі ажыццяўляюцца самаідэнтыфікацыя чалавека як актыўнага носьбіта прававой і абавязкавай, улашых кожнаму члену грамадзянскай супольнасці, фарміраванне канстытуцыйнага патрыятызму.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што канстытуцыйны патрыятызм прадвызначае павышэнне канстытуцыйнай культуры, уключаючы ўсведамленае прызнанне неабходнасці жыць і дзейнічаць у адпаведнасці з канстытуцыйнымі заканадаўчымі і маральнымі нормамі. Сутнасць канстытуцыйнага патрыятызму заключаецца ў тым, што грамадзяне не толькі праяўляюць любоў і павагу да сваёй Айчыны, народа, яго гісторыі, культуры, маюць гонар за сваю прыналежнасць да Радзімы, але і ўспрымаюць сябе як носьбітаў прававой самасвядомасці, якая ўключае ў сябе ўсведамленае прызнанне і выкананне заканадаўства, якія падлягаюць прымяненню судамі пры разгляданні канкрэтных спраў. Тым самым на Канстытуцыйны Судускладваецца функцыя выяўленняканстытуцыйна-прававога зместу канстытуцыйных прынцыпаў і норм пры прававырашэнні.

Такім чынам, прававарыянтная практыка, якая ажыццяўляецца ў адпаведнасці з канстытуцыйным рэгуляваннем, на аснове здзяканалення заканадаўства ў дачыненні розных відаў прававых поўнаў, адрэзвальсі і эфектыўных сродкаў рэалізацыі канстытуцыйных палажэнняў, дазваляе мінімізаваць рызыкі парушэння канстытуцыйных прынцыпаў і норм, пагроз канстытуцыйнаму прававладарству.

3. Забеспячэнне дзеяння палажэнняў абноўленай Канстытуцыі прадугледжвае наяўнасць высокага ўзроўню прававой культуры. Улічваючы, што дэфармаванае грамадскае думка можа стаць прычынай юрыдычных канфліктаў, прывесці да «нестыкоўкі» патрабаванняў Канстытуцыі і чаканняў грамадства, неабходна пастаяннае растлумачанне канстытуцыйных палажэнняў, рэалізацыя на масавую аўдыторыю з розным узроўнем прафесійнай і агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі, розных поглядаў.

Абавязковай умовай з'яўляецца прадаўжэнне работы па выхаванні грамадзян у духу адказнасці за развіццё канстытуцыйных ідэалаў. Прыцягненне ўвагі насельніцтва да канстытуцыйных пераўтварэнняў здольна забяспечыць не толькі падтрымку грамадзянамі зменненняў і дапаўненняў Асноўнага Закона, але і прыхільнасць да канстытуцыйных каштоўнасцей, садзейнічаючы тым самым далейшаму ўкараненню іх у грамадскую практыку.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што ў асноне павышэння ўзроўню канстытуцыйнай культуры і грамадскай прававсведамасці павінна знаходзіцца ідэя сусветнага канстытуцыяналізму, важнейшымі складнікамі якога выступаюць вяршэнства Канстытуцыі і вяршэнства права, неўхільнае выкананне канстытуцыйных прадпісанняў усімі дзяржаўнымі органамі, службовымі асобамі, арганізацыямі і грамадзянамі, устанаўленне балансу інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы на аснове канстытуцыйных палажэнняў, выкананне і фарміраванне асобы як грамадзяніна, які свядома і добраахвотна выконвае законы сваёй краіны і здольны праяўляць канстытуцыйны патрыятызм пры абароне канстытуцыйнай і ідэалаў Канстытуцыі.

II

Палажэнні абноўленай Канстытуцыі выступаюць у якасці нарматыўна-прававой асновы, сацыяльна-прававога вынікаў дзяржаўнай, грамадскай і асабістай бяспекі, забеспячэнне якіх дазваляе дасягнуць пайнацэннай рэалізацыі канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

Ва ўмовах глабалізацыі, інтэграцыі і ўзаемазалежнасці грамадскіх і міждзяржаўных працэсаў абавязковай умовай паступальнага і дынамічнага развіцця дзяржавы і грамадства выступае гарантаванне канстытуцыйнай бяспекі, сутнасць якой заключаецца ў забеспячэнні і абароне правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, найбольш важных інтарэсаў грамадства і дзяржавы ад унутраных і знешніх пагроз.

Пры гэтым гарантаванне канстытуцыйнай бяспекі немагчыма без забеспячэння канстытуцыйнага прававладарскасці, які, з'яўляючыся адной з сучасных характарыстык канстытуцыяналізму, заключаны гарманізаваць дзяржаўнае і грамадскае развіццё, гарантаваць стабільнасць канстытуцыйна-прававога жыцця.

Зацвярджэнне канстытуцыйнага правапарадку азначае, што прававыя нормы, якія рэгулююць грамадскія адносіны ў розных сферах сацыяльнай рэчаіснасці, павінны грунтавацца на палажэннях Канстытуцыі, а прававыя інстытуты і галіны права знаходзіцца ў сістэмнай узаемасувязі, утвараючы стройную прававую сістэму, якая ўключае канстытуцыйныя прынцыпы і нормы як не фундаментальную аснову. Пры выкананні гэтых умоў абавязковая нарматыўная сіла права падмацоўваецца стогасцыю яго канстытуцыі і мэтаў тлумачэння, а грамадскія адносіны адпавядаюць канстытуцыйным прадпісанням з прычыны неўхільнага і пастаяннага іх выканання.

Канстытуцыйны прававарыянтнасць — важнейшы фактар дзейснай абароны правоў і свабод грамадзян, канстытуцыйнага ладу, дасягнення грамадзянскай згоды. Зацвярджэнне канстытуцыйнага правапарадку ў заканадаўстве і прававарыянтнасці азначае, што канстытуцыйныя правы і свабоды трансфармуюцца ў дэмакратычна замацаваныя нормы жыцця, якія абавязковыя для кожнага грамадзяніна і грамадства ў цэлым, дзеянне якіх гарантуецца і паслядоўна выконваюцца імі.

Значную ролю ва ўмацаванні канстытуцыйнага прававарыянтнасці ў сучасных умовах мае канстытуцыяналізацыя права, якая забяспечваецца заканадаўствам і правапрымяняльнай практыкай, прынцыпам дзеяння Канстытуцыі як вызначальным фактарам гарманічнага і ўстойлівага развіцця грамадства і дзяржавы, а таксама заканаенем канстытуцыйна-прававога рэжыму прававырашэння.

Вярхоўствам і прынцыпам дзеяння Канстытуцыі прадвызначаны важнейшыя механізмы, якія гарантуюць узгадненне канстытуцыйных палажэнняў у жыццё.

Праз зацвярджэнне вяршэнства Канстытуцыі, канстытуцыйных каштоўнасцей і нарматыўнасці і прапарцыянальнасці ажыццяўляецца гарадскіх адносін, устанаўліваецца крыніца іх легітымізацыі, якая прадвызначаецца ўсенародным рэферэндумам і прадстаўленымі ад імя народа прадстаўнічымі органамі ўлады, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць на аснове Канстытуцыі і ў межах яе паўнамоцтваў.

Прынцып вярхоўства права ў канстытуцыйнай сістэме прадугледжвае, што ўсе органы і службовыя асобы, а таксама грамадзяне і грамадзяне дзейнічаюць на аснове і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, а права як важнейшы сацыяльны рэгулятар забяспечвае дасягненне мэт і выразнае задач, вызначаных Асноўным Законам дзяржавы.

Прамое дзеянне Канстытуцыі абумоўлівае інтэграцыю канстытуцыйнай мадэлі арганізацыі грамадскіх адносін у сацыяльную практыку як непасрэдна, так і шляхам выпрацоўкі на заканадаўчым узроўні прававых механізмаў для поўнай рэалізацыі грамадзянамі замацаваных у Канстытуцыі правоў і свабод, а таксама непасрэдзае прымяненне канстытуцыйных норм усімі правапрымяняльнымі органамі шляхам іх індывідуалізацыі і ўлікам жыццёвай сітуацыі, якая патрабуе вырашэння ў адносінах да канкрэтнага суб'екта правадносін.

Канстытуцыяналізацыя права прыводзіць да фарміравання прававой асновы — персоны, якая дзякуючы праву валодае ўласнай ў палітычнай і сацыяльна-прававой рэчаіснасці, у поўнай меры рэалізуе свае правы і выконвае абавязкі, з'яўляецца актыўным удзельнікам канстытуцыйных правадносін, садзейнічае фарміраванню рэальнага грамадскага даверу паміж людзьмі, розными сацыяльнымі групамі і дзяржавай, які захаваюе кожнага члена грамадства да канструктыўнага і ўсеагульнага волевыяўлення.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што ва ўмацаванні канстытуцыйнага прававарадкаў значная роля належыць маральным канстытуцыям, якія ўяўляюць сабой асноў аб'яднання грамадзян, стабільнасці і дынамізму канстытуцыйнага развіцця, умацавання канстытуцыйна-прававой бяспекі, дасягнення стану прававой абароненасці асобы, грамадства і дзяржавы ад сучасных выклікаў і пагроз.

Важнае значэнне ў працэсе канстытуцыяналізацыі права і забеспячэнні канстытуцыйнага прававарадкаў мае дзейнасць Канстытуцыйнага Суда, які пры ажыццяўленні канстытуцыйнага правасуддзя, выяўляючы і раскрываючы канстытуцыйны зместаў канстытуцыйнага, прынцыпаў і норм, арыентуе заканадаўцу і прававрымяняльніка на ўвасабленне шматграннага зместу Канстытуцыі, недапушчальнасць скажэння канстытуцыйных палажэнняў у заканадаўстве, праваразумення і прававрымянення, у неабходных выпадках указвае на ажыццяўленне новага або дадатковага прававога рэгулявання грамадскіх адносін у канкрэтных сферах ажыццяўлянасці, вызначае крынкі ўдасканалення заканадаўства.

Паслядоўнае ажыццяўленне канстытуцыяналізацыі права садзейнічае ўмацаванню канстытуцыйнага правапарадку, павышэнню эфектыўнасці рэалізацыі заканадаўчай дзейнасці органаў публічнай улады. Ступень рэалізацыі Канстытуцыі і канстытуцыйнага заканадаўства вызначае якасны стан канстытуцыйнага прававарадку ў дзяржаве.

III

Канстытуцыйны кантроль у Рэспубліцы Беларусь, закліканы забяспечваць належны канстытуцыйна-прававы баланс уладных паўнамоцтваў дзяржаўных органаў, раўнаважу ўсіх грамадска-палітычных сіл у дзяржаве, на сучасным этапе канстытуцыйнага развіцця з'яўляецца фактарам стабільнасці і ўстойлівага развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Аналіз аснойных этапаў станаўлення і функцыянавання канстытуцыйнага кантролю сведчыць аб заканамерным і паступальным удасканаленні сістэмы канстытуцыйнага кантролю, пашырэнні яго задач у дзяржаўна-прававым механізме абароны асноў канстытуцыйнага ладу, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

У 2008 годзе Канстытуцыйны Суд быў надзелены правам ажыццяўляць абавязковы папярэдні кантроль канстытуцыйнасці ўсіх заканоў, прынятых Палатой прадстаўнікоў і Саветам Рэспублікі, да падпісання Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

За перыяд з 2008 па 2022 год Канстытуцыйным Судом прынята 1026 рашэнняў, у якіх даадзена ацэнка якасці заканатворчасці і прававога рэгулявання грамадскіх адносін у розных сферах на аснове прынцыпаў і норм Канстытуцыі.

У названы перыяд Канстытуцыйным Судом распрацавана метадалагічная аснова канстытуцыйнага правапарадку, якая ўключае ў сябе канстытуцыйна-прававы рэгулятар спраў, фарміраванне прававых пазіцый, адрасаваных заканадаўцу і праварымяняльнікам.

Сваімі рашэннямі, прынятымі ў парадку абавязковага папярэдняга кантролю заканаў, Канстытуцыйны Суд аказаў пазітыўны ўплыў на развіццё канстытуцыйнай дактрыны. Прававыя пазіцыі, якія фарміраваліся Канстытуцыйным Судом аказваюць істотнае і глыбокае дактрынальнага прававога аналізу канстытуцыйных норм у іх лагічнай узаемасувязі, садзейнічалі забеспячэнню адзінства і згодненага ўзаемадзеяння ўсіх дзяржаўных органаў у адпаведнасці з іх канстытуцыйнымі паўнамоцтвамі, выкананню канстытуцыйнай заканадаўчай працэсе і правапрымяняльнай практыцы, забеспячэнню і абароне заканадаўцы і Канстытуцыі прававога і свабод чалавека і грамадзяніна.

Ва ўказаных рашэннях Канстытуцыйным Судом сфармулявана 305 прававых пазіцый, у якіх увага заканадаўца звярталася на выяўленыя ў законах выпадкі прававой нявызначанасці, прабелы ў заканадаўстве, прамяніальнікам указвалася на неабходнасць дакладнага разумення зместу заканадаўчых норм і захавання канстытуцыйна-прававога рэжыму іх прымянення ў сваёй дзейнасці. Прававыя пазіцыі Канстытуцыйнага Суда аб неабходнасці ўстараняць выяўленыя канстытуцыйна-прававыя дэфекты заканадаўчага рэгулявання дазвалялі перадоплаць прававую нявызначанасць норм законаў без прыняння іх новых канстытуцыйных і тым самым садзейнічалі фарміраванню прававарыянтнай практыкі на канстытуцыйна-прававой аснове.

У шэрагу прававых пазіцый Канстытуцыйны Суд з улікам рэальнай практыкі сучаснага канстытуцыяналізму вызначаў канстытуцыйна-дактрынальныя падыходы да ўдасканалення прававой сістэмы дзяржавы, указваў канкрэтныя крокі заканадаўчага рэгулявання грамадскіх адносін, вызначаў канкрэтныя крокі прымянення прававых норм.

1. У рашэннях Канстытуцыйнага Суда сфармуляваны прававыя пазіцыі, якія канстатуюць рэалізацыю і падтрымку ў законах канстытуцыйных прынцыпаў і норм, устанаўленне неабходных прававых механізмаў для гарантавання непахіснасці асноў канстытуцыйнага ладу, забеспячэння і абароны правоў і свабод чалавека як найвышэйшай каштоўнасці і мэты дзяржавы і грамадства.

У рашэнні па зменені законаў, якія рэгулююць пытанні эфектыўнага функцыянавання ваенной арганізацыі дзяржавы, адзначана, што пры прадаставленні адтэрміноўкі ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу па кантракце для праходжання ваеннай заканадаўцу выходзіў з неабходнасці дасягнення разумнага і справядлівага балансу памяж мэтамі, з аднаго боку, падпарадкаванасці ваеннаабавязаных, з другога — забеспячэння ўмоў для далейшага ўкаранення лічбавых інавацый.

У рашэнні па праверцы канстытуцыйнасці змянення Гаспадарчага працэсуальнага, Грамадзянскага працэсуальнага, Крымінальна-працэсуальнага кодэксаў Рэспублікі Беларусь указана, што пашэнні прававраемага Закона, якімі прадугледжвалася выкарыстанне ў судаводстве сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, садзейнічаць дакладнаму і паслядоўнаму ажыццяўленню правасуддзя па разбору, вынясенню законных і абгрунтаваных судовых пастаноў у адпаведнасці з даследаваным у судовым пасяджэнні доказамі, гарантуюць ажыццяўленне дзейсным кантролю вышэйшымі судовымі інстанцыямі за выкананнем судамі патрабаванняў закона пры вырашэнні спраў і тым самым забяспечваюць рэалізацыю канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону яго правоў і свабод у поўным абсёме праз правасуддзе, якое адпавядае крытэрыям адкрытасці, галоснасці і справядлівасці (рашэнне ад 8 лютага 2020 г.).

5. У шэрагу рашэнняў Канстытуцыйнага Суда адзначалася замацаванне ў законах палажэнняў, накіраваных на выкананне Рэспублікай Беларусь міжнародных абавязацельстваў, апрацаванне нацыянальным прававым інтэграваных працэсаў, імплементацыю норм міжнароднага і нацыянальнага права ў прававую сістэму Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым звярталаса ўвага на тое, што ва ўмовах трансфармацыі прававой сістэмы, калі прадугледжваецца рэгуляванне грамадскіх адносін нарадзе з актамі нацыянальнага заканадаўства заканамерна ўзнікаюць рызыкі рэальнай супярэчнасці актаў міжнароднага і нацыянальнага права, крыўдзеем легітымнасці такога рэгулявання, выходзяны з вяршэнства Канстытуцыі, з'яўляецца гарантаванне забеспячэння і абароны канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян, захавання канстытуцыйнай ідэнтычнасці.

У рашэнні па заканадаўчым рэгуляванні абароны правоў спажыўцоў зроблены вывад, што ўдасканаленне прававога рэгулявання ў частцы абавязковага выканання пастаноў ва ўказаных сферах, накіраванае на выкананне міжнародных абавязацельстваў (рашэнне ад 8 чэрвеня 2018 г.).

Такім чынам, пры праверцы канстытуцыйнасці законаў у парадку абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйны Суд звяртаў увагу заканадаўца на неабходнасць своечасовай выпрацоўкі прававых механізмаў, накіраваных на гарантаванне непасрэдна ў законах канстытуцыйнага ладу, захаванне ў заканадаўстве справедлівага балансу інтарэсаў грамадзяніна, грамадства і дзяржавы, забеспячэнне актыўнага ўдзелу грамадзян, грамадскіх аб'яднанняў у прыняцці важнейшых дзяржаўных рашэнняў, якія датычацца іх правоў і законных інтарэсаў; арыентавалі праварымяняльнікаў на неабходнасць дакладнага разумення зместу заканадаўчых норм і захавання канстытуцыйна-прававога рэжыму іх прымянення ў сваёй дзейнасці.

IV

На сучасным этапе развіцця беларускай дзяржаўнасці далейшае здзяканалення канстытуцыйнага заканаў у парадку абавязковага папярэдняга кантролю грунтуецца на вяршэнстве Канстытуцыі, паслядоўнай прыхільнасці да канстытуцыйных каштоўнасцей, прынцыпаў і мэт.

У абноўленай Канстытуцыі ўдасканалена прававая прырода Канстытуцыйнага Суда: ажыццяўленне кантролю за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў у дзяржаве ў мэтах абароны канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, гарантаванні Канстытуцыйнай прэзідэнцкай улады, забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі і яе прамога дзеяння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама вызначана на абавязковая форма правасуддзяў, у якой Канстытуцыйны Суд рэалізуе сваю кампетэнцыю, — канстытуцыйнае судаводства.

Палажэннямі Канстытуцыі істотна пашыраны паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суда.

Згодна з артыкулам 116 Канстытуцыі, Канстытуцыйны Суд па прапановах Прэзідэнта, Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу, Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі, Вярхоўнага Суда, Савета

цыпу прававой вызначанасці ўстанаўлення адзінства ў азначэнні даданага тэрміна, якое можа быць забяспечана шляхам узаемазгаднення норм адпаведных законаў.

Прававая пазіцыя ўлічана ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 10 кастрычніка 2022 г. № 209-З «О изменении законов по вопросам обработки персональных данных», згодна з якім законы Рэспублікі Беларусь «Об информации, информатизации и защите информации» і «О регистре населения» дапоўнены палажэннямі аб тым, што адпаведныя тэрміны «персональные данные» і «обработка персональных данных» выкарыстоўваюцца ў гэтых законах у значэннях, вызначаных Законам Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2021 г. № 99-З «О защите персональных данных».

Канстытуцыйны Суд адзначае, што рэалізацыя ў законах прававых пазіцый Канстытуцыйнага Суда сведчыць аб выкананні прынцыпу вяршэнства права, ажыццяўленні прававога рэгулявання ў адпаведнасці з прынцыпамі і нормамі Канстытуцыі, рэальным прызнанні канстытуцыйнай правасвядомасці і прававой культуры, што садзейнічае павышэнню даверу грамадзян да органаў дзяржаўнай улады, забеспячэнню канстытуцыйнай законнасці.

VI

1. Заканатворчая дзейнасць Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у 2022 годзе была накіравана на прынятае законам, якія забяспечваюць рэалізацыю палажэнняў абноўленай Канстытуцыі, а таксама іншых законаў, якія рэгулююць важныя грамадскія адносіны.

У прынятых законах рэалізаваны прававыя пазіцыі, сфармуляваныя ў рашэннях Канстытуцыйнага Суда, якія садзейнічаюць устанаўленню прававой вызначанасці ў канстытуцыйна-прававым рэгуляванні.

У 2022 годзе ўпаўнаважаныя органы — Прэзідэнт, Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, Вярхоўны Суд, Савет Міністраў — з прапанавані аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў у Канстытуцыйны Суд не звярталіся, што сведчыць аб дасягнутым на канстытуцыйнай аснове высокім прававым узроўнявані грамадскіх адносін, належным узаемадзеянні дзяржаўных органаў, якія ўдзельнічаюць у заканатворчым працэсе, недапушчэнні парушэнняў канстытуцыйных прынцыпаў і норм.

2. Абноўленая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, з'яўляючыся вынікам грамадскай згоды, змяшчае мадэль палітычнай і сацыяльна-эканамічнай ладу дзяржавы і грамадства, вызначае ўдакладненую стратэгію далейшага канстытуцыйна-прававога развіцця Беларусі ва ўмовах існых выклікаў сучаснасці, выступае асновай фарміравання эфектыўных канстытуцыйна-прававых механізмаў забеспячэння міру і нацыянальнай бяспекі, канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, народаўладдзя, дзяржаўнага суверэнітэту.

Уласабленне ў жыццё канстытуцыйных заменнасцей, зацвярджэнне канстытуцыйнай заканнасці абмоўліваюць необходнасць прынята законаў і іншых нарматыўных прававых актаў, якія ў поўнай меры раскрываюць рэгулятыўны патэнцыял Канстытуцыі як Асноўнага Закона краіны.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што ў працэсе канстытуцыяналізацыі права патрабуюцца пастаяннае забеспячэнне сістэмнасці і якасці заканадаўства, пераход да ўзаемнай заканатворнай палітыкі, накіраванай на паўнавартасную рэалізацыю канстытуцыйных норм-мэтаў, норм-прынцыпаў, норм-правілаў шляхам выпрацоўкі эфектыўных заканадаўчых механізмаў аховы правоў чалавека і грамадзяніна, народаўладдзя, дзяржаўнага суверэнітэту.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што якасць выканання канстытуцыйнага абавязку грамадзянамі залежыць ад узроўню іх прававзрослага і канстытуцыйнай культуры, стварэння дзяржавай умоў, якія матывуюць асобу да добрасавотнага, добраўзмоцненага і ініцыятыўнага выканання свайго абавязку.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што ў аснове дзейснасці канстытуцыйнага абавязку павінна знаходзіцца патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне, якое дазваляе ў грамадскім гонар за сваю Радзіму — Беларусь, беражлівым адносіны да культурнай і духоўнай спадчыны, гістарычнай прайды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, павазе да закона, разуменне ролі дзяржавы ў супрацьдзеянні сучасным выклікам і гатоўнасць асабістага ўдзелу ў забеспячэнні бяспекі грамадства і дзяржавы.

4. Канстытуцыйная прававзрослаемасць як вышэйшая форма прававспадомасці і светапогляднае ядро прававой культуры адыгравае ключавую рэгулюючую і перайтваральную ролю ў жыцці грамадства і дзяржавы, у рэалізацыі канстытуцыйна-нарматыўнага зместу Канстытуцыі.

Канстытуцыйны Суд адзначае, што канстытуцыйна арыентаваная прававядомасць з'яўляецца вызначальнай у дзейнасці ўсіх прадстаўнікоў органаў публічнай улады, службовых і іншых асоб, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый.

Прававядомасць як працэс і адначасова вынік фарміравання канстытуцыйна-прававога мыслення прадугледжвае веданне грамадзянамі змешчаных у Асноўным Законе палітыка-прававых, ідэалагічных і этычных каштоўнасцей, каштоўнасці і мэт, уменне арыентавацца ў прававой інфармацыі і прытрымлівацца канстытуцыйных прынцыпаў і норм у сваіх паводзінах і прафесійнай дзейнасці.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што прыярытэтнай дзяржаўнай задачай з'яўляецца прававая асвета, прававое выхаванне і адукацыя моладзі. Пры гэтым наогамні сям'і, школы, грамадства і дзяржавы павінны быць накіраваны на прававое ведаў не толькі аб канстытуцыйных правах і свабодах, але і аб абавязках, юрыдычнай адказнасці за іх невыкананне, а таксама на прывіццё духоўных каштоўнасцяў, якія садзейнічаюць фарміраванню высокіх маральных і прававласумных паводзін асобы.

5. Замацаванне ў Канстытуцыі дэмакратычнага характару дзяржавы, устанаўленне права народа ажыццяўляць свою ўладу непасрэдна, праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, якія вызначаюцца Канстытуцыяй, абумоўліваюць магчымасць удзелу грамадзян у вырашэнні важнейшых пытанняў жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы.

Дата и время проведения повторных электронных торгов 13 апреля 2023 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Кап. строение с инв. № 222/С-58207 площадью 237,4 кв. м по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85/2, наименование: здание контрол., назначение: здание административно-хозяйственное, расположенное на земельном участке с кад. № 224050100002000735 площадью 1,5999 га по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85 (право аренды), целевое назначение зем. участка – зем. участок для обслуживания комплекса зданий.
Нач. цена: 36 192,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток:** 3619,20 бел. руб.

Лот № 2. Кап. строение с инв. № 222/С-36106 площадью 414,7 кв. м по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85/1, наименование: база отстоя автомобилей, назначение: здание многофункциональное, составные части и принадлежности: навес, крыльца; расположенное на земельном участке с кад. № 224050100002000735 площадью 1,5999 га по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85 (право аренды), целевое назначение зем. участка – зем. участок для обслуживания комплекса зданий.
Нач. цена: 70 944,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток:** 7094,40 бел. руб.

Лот № 3. Кап. строение с инв. № 222/С-57567 площадью 914,7 кв. м по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85/5, наименование: склад-магазин стройматериалов, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кад. № 224050100002000735 площадью 1,5999 га по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85 (право аренды), целевое назначение зем. участка – зем. участок для обслуживания комплекса зданий.
Нач. цена: 97 344,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток:** 9734,40 бел. руб.

Лот № 4. Кап. строение с инв. № 222/С-57568 площадью 158,2 кв. м по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85, наименование: магазин «Стройматериалы», назначение: здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции, расположенное на земельном участке с кад. № 224050100002000735 площадью 1,5999 га по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85 (право аренды), целевое назначение зем. участка – зем. участок для обслуживания комплекса зданий.
Нач. цена: 48 960,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток:** 4896,00 бел. руб.

Лот № 5. Кап. строение с инв. № 222/С-57606 площадью 540,0 кв. м по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85/8, наименование: склад-магазин стройматериалов (склад), назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кад. № 224050100002000735 площадью 1,5999 га по адресу: Витебская обл., Поставский р-н, г. Поставы, ул. Вокзальная, 85 (право аренды), целевое назначение зем. участка – зем. участок для обслуживания комплекса зданий.
Нач. цена: 57 024,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток:** 5702,40 бел. руб.

**Обременение по лотам №№ 1–5

Актуальна

ТРЫМАЦЬ ПАЗІЦЫІ І ДУМАЦЬ ПРА ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

Клопаты і спадзяванні старшыні Ваўкавыскага райвыканкама Міхаіла СІЦЬКО

Размова з кіраўніком раёна пачалася з надзённага. Міхаіл Міхайлавіч акрэсліў найбліжэйшыя планы. Сярод іх — установка новай Дошкі гонару. Такая дошка ўжо ёсць, але новая будзе больш прэзентабельная, з падсветкай. Вось-вось пачнецца пасяўная кампанія. Яна павінна прайсці стабільна: мінеральных угнаенняў набыта больш, чым летась, якасна выкананы рамонт тэхнікі, нарыхтавана па патрэбах колькасць насення. Мінулы год прынёс рэкордны ўраджай — 50 цэнтнераў з гектара, да гэтага ўзроўню тут будуць імкнуцца і сёлета. Блізіцца месячнік па добраўпарадкаванні, да якога павінна падключыцца насельніцтва. А ўлады будуць працягваць работу па рамонце і бетаніраванні дварою і дарог. І гэта толькі невялікая частка тых клопатаў, у якіх жыве старшыня райвыканкама. Ёсць і грунтоўныя праекты. Аб іх кіраўнік раёна расказаў больш падрабязна.

— Міхаіл Міхайлавіч, як вядома, урадам дадзена ўстаноўка запусціць кожнаму раёну да 2025 года па значным інвестпраекце. Раскажыце, што ў вас за праект?

— У нас такім праектам стане вытворчасць RDF-паліва. Праект планавецца рэалізаваць у рамках дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе». Гаворка ідзе аб будаўніцтве рэгіянальнага комплексу па выкарыстанні цвёрдых бытавых адходаў, у рамках якога і будзе ажыццяўляцца выпуск RDF-паліва. Рэалізацыя праекта дазволіць мінімізаваць шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе, атрымаць альтэрнатыўнае паліва і стварыць новыя працоўныя месцы. Атрыманае такім чынам паліва будзе выкарыстоўвацца для вытворчасці цэменту на прадпрыемстве «Краснасельскбудматэрыялы».

Для Ваўкавыска гэта актуальная тэма. Па-першае, таму што ў нас няма ніводнай лініі па сартыроўцы бытавых адходаў і большая частка іх ідзе на палігон. Па-другое, на цэментным заводзе ўжо ёсць абсталяванне для такога віду паліва, і яно не поўнасцю загружана. Да таго ж RDF-паліва дазволіць эканоміць расход газу.

Наш праект адобраны, сёлета за кошт аператара другаснай сыравіны выдзяляюцца сродкі на праектныя работы. Гэта будзе наша асноўнае прадпрыемства, якое зробіць свой унёсак у развіццё эканомікі раёна. Наш галоўны праект мы плануем ажыццявіць да 2025 года.

— А якія-небудзь сумесныя праекты з замежнымі партнёрамі могуць з'явіцца?

— Праект пакуль толькі на стадыі разгляду. Тым не менш ён даволі перспектыўны і датычыць вытворчасці феерверкаў. Даўно падыходзілі да гэтай тэмы, вывучалі яе. Зараз плануем прыступіць да больш дэтальнага абмеркавання сумесна з кітайскім бокам. Магчыма, атрымаецца наведаць наш горад-пабрацім у Кітаі, дзе з'явіцца магчымасць убачыць тэхналогіі вытворчасці феерверкаў. Гэта справа ў Беларусі новая, але ў нас ёсць неабходныя ўмовы. У якасці пляцоўкі плануем здзейсніць былы ваенны аэрадром. На ім адводзіцца плошча прыкладна ў 500 гектараў, дзе павінны размясціцца трывалыя сховішча і склады. Там будзе арганізавана і сама вытворчасць.

Раней феерверкі завозіліся з Еўропы, пазней іх стаў пастаўляць Кітай. Магчыма, у нас будзе створана суменснае прадпрыемства. Тэма запатрабаваная, на гэту прадукцыю ёсць попыт.

— Верагодна, і сацыяльныя аб'екты не застаюцца па-за ўвагай кіраўніка раёна. Ведаю, што вы вельмі адказна ставіцеся да «сацыялкі». Што мяркуеце ажыццявіць у найбліжэйшы час?

— Пачну з медыцынскай тэмы. Некалькі гадоў таму ў гарадзе ўведзены ў эксплуатацыю новы корпус раённай бальніцы. Гэта ўстанова — прыклад сучаснага медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. У нас ёсць тыпавы праект басейна. Мы не адзін год падступаліся да яго, і вось, нарэшце, вызначыліся. Будзем будаваць з нуля. Падобны комплекс нядаўна з'явіўся ў Навагрудку. Калі мы зробім такі ж, нашы жыхары не будуць ездзіць у басейны ў Гродна і Брэсцкую вобласць, а змогуць прыйсці сюды і будуць удзячны за такі падарунак. Мяркуем, што праект хутка сябе акупіць. Разлічваем яго рэалізаваць да 2024 года. Будаўнічых магутнасцяў хапае. А стары будынак выставім на продаж.

— Якія ў раёна ёсць перавагі, што можна выкарыстаць?

— Спадзяюся, турызм. У нас ёсць два даволі буйныя санаторыі — прадпрыемствам «Гроднаэнерга» і «Краснасельскбудматэрыялы» — гэта «Энергетык» і «Праleска». Тут праходзіць аздараўленне не толькі працоўных калектыў, але і шырокае кола ахвотных. Таксама сапраўдная разынка — нашы так званыя «Мальдзівы». Многія ведаюць пра знакамітыя бірзовыя кар'еры, дзе здабывалі крэйду. Адзін з такіх кар'ераў можна аглядаць на бяспечнай пляцоўцы, якая там абсталявана ў мінулым годзе. Гэта месца стала часткай прамысловага маршруту, які ўключае вытворчасць па выпуску цэменту, музей з рэдкімі экспанатамі і наведванне «Мальдзіваў». Думаем, сёлета турыстаў будзе больш. Усяго ў раёне распрацавана да дзясятка экскурсійных маршрутаў і некалькі веласіпедных.

— З якімі пытаннямі да вас часцей за ўсё звяртаюцца падчас прамых ліній?

— Зараз актуальнае пытанне — добраўпарадкаванне нашага мікрараёна Паўднёвы. У свой час мы зрабілі вялікі рывок: больш за 1,3 тысячы зямельных участкаў было вылелена для будаўніцтва індывідуальнага жылля. Людзі пабудаваліся, зараз трэба ўдасканальваць інфраструктуру. Гэта паступова ажыццяўляецца. На Новы год, напрыклад, мы адкрылі там аўтобусны маршрут. На чарзе — дарожнае будаўніцтва.

Яшчэ адно актуальнае пытанне для раёна — падтапленне тэрыторый дачных участкаў, размешчаных у пойме ракі Рось. З вучэбна-навукова-вытворчым рэспубліканскім прадпрыемствам «УНІ-ТЭХПРАМ БДУ» заключаны дагавор на распрацоўку плана па комплексе мераприемстваў, накіраваных на ўтрыманне паверхневых водных аб'ектаў у належным стане. Пасля пачнецца рэалізацыя дадзенага плана.

Маргарыта УШКЕВІЧ
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вытворчасць

Кіты эканомікі

Таццяна АНДРУШКЕВІЧ,
намеснік старшыні
Ваўкавыскага райвыканкама:

— На тэрыторыі раёна дзейнічае дзевяць прамысловых прадпрыемстваў. Найбольшую ўдзельную вагу складае харчовая прамысловасць — 66 % і вытворчасць будаўнічых матэрыялаў — амаль 30 %. Асноўныя вытворцы — акцыянерныя таварыствы «Беллакт», «Ваўкавыскі мясакамбінат» і «Краснасельскбудматэрыялы». Гэта тры горадастваральныя прадпрыемствы.

ААТ «Беллакт» — адзіны ў Беларусі і найбуйнейшы ў СНД вытворца сухога дзіцячага харчавання. Усяго тут выпускаецца да 40 найменняў сухіх малочных сумесяў і каш. Таксама прадпрыемства выпускае шырокі асартымент малочнай прадукцыі. За мінулы год агульны аб'ём прадукцыі прадпрыемства ў прамысловасці раёна склаў каля 41 %.

Ваўкавыскі мясакамбінат у вытворчым аб'ёме раёна складае 25 %. Гэта найбуйнейшы вытворца мяса і мясных вырабаў у Беларусі. Усяго тут вырабляецца да 300 відаў мясной прадукцыі.

Асноўны прамысловы гігант раёна — ААТ «Краснасельскбудматэрыялы». Летась амаль 25 % аб'ёму прамысловасці раёна склала менавіта прадукцыя завода. За больш чым стагадовую гісторыю у вытворчасці цэменту завод пераўтвараўся ў шматпрофільнае прадпрыемства, якое выпускае прадукцыю пераважна з уласнай сыравіны. Сучаснае абсталяванне дазволіла дасягнуць высокіх міжнародных стандартаў.

Памяць

«МЫ СТАРАЕМСЯ ДАНОСІЦЬ ПРАЎДУ АБ ТОЙ ВАЙНЕ»

Чым уражвае музей воінаў-інтэрнацыяналістаў у Ваўкавыску

Ідэя стварэння такога музея з'явілася больш чым дваццаць гадоў таму разам з заснаваннем раённай арганізацыі. Першыя экспанаты і фотаздымкі былі размешчаны ў будынку Цэнтра тэхнічнай творчасці. Пазней арганізацыі быў перададзены будынак былога сельвыканкама. А нядаўна музей набыў новы адрас. Экспазіцыя пераехала ў новае памяшканне, у будынку якога размесціцца офісы ўсіх грамадскіх арганізацый раёна, у тым ліку прадстаўніцтва Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане.

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Іван МАРЖАЛА і старшыня савета раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Святаслаў КАРАЛЮК.

Экспанаты размясцілі на стэндах. У асноўным гэта фотаздымкі і асабістыя рэчы ваўкавыскіх жыхароў, якія прайшлі вайну ў Афганістане. Рэчы загінулых сваякоў перададзены ў музей іх роднымі. У фарміраванні экспазіцыі дапамагала раённая ветэранская арганізацыя. З цягам часу музей папаўняўся. Інтэрнацыяналісты прыносілі свае асабістыя рэчы, фотаздымкі, якія цікава афармлялася. З'явіліся экспанаты дэсантнікаў, спецназаўцаў, ваенных лётчыкаў, танкістаў, мінёраў. Музею падарылі агульнавайсковую зімнюю і летнюю форму кантынгенту войск у Афганістане. Да чарговага юбілею вывазу войск сталічным музеем Вялікай Айчыннай вайны быў перададзены сцяг з сертыфікатам. Гэты вялікі сцяг зараз вісіць над сталлюю ў новым памяшканні музея.

Тут упэўнены, што музей не будзе пуставаць. Ужо складзены графік яго наведвання школьнікамі Ваўкавыскага раёна. Дарэчы, у 19 школах раёна створаны куткі воінаў-афганцаў.

Па словах старшыні Ваўкавыскай раённай арганізацыі Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане Святаслава Караляка, арганізатары імкнуцца да таго, каб наведвальнікам было цікава не толькі слухаць расповеды аб вайне, але і бачыць рэчы, якія звязаны з тымі падзеямі. Сам Станіслаў Васільевіч падчас баявых дзеянняў быў начальнікам штаба асобнага дарожна-камендацкага батальёна на перавале Саланг, які займаўся пропускам калон ваенных і грамадзянскіх машын, іх аховай. Складанасць была ў высакагорным клімаце: недахоп кіслароду, лавіны, селявыя патокі. Каб пазбегнуць абстрэлаў калоны і праехаць, даводзілася прабіваць тунэлі ў горных пародах.

У музеі можна ўбачыць даволі цікавыя экспанаты-манекены, якія зрабіў тутэйшы майстар-аматар. Тут прадстаўлена нават фігура душмана ў нацыянальным адзенні. Каскі, шлемы, радыёстанцыі, вялікі парашут, форма, маскхалаты, узнагароды — усяго не пералічыць. Ваенная зброя, рэшткі снарадаў, авіябомбы — таксама з той вайны. Яскрава дапаўняе прадстаўленне аб тых падзеях фотаэкспазіцыя з партрэтамі інтэрнацыяналістаў. Асобна вылучаны тыя землякі, якія загінулі падчас баявых дзеянняў. Іх шэсць. А ўсяго на тэрыторыі раёна пражывае 222 воіны-афганцы. «Мы стараемся захаваць памяць і праўду аб той вайне, даносіць да сённяшняга пакалення, і моладзі гэта цікава», — зазначыў Святаслаў Караляк.

Экспанаты музея пераносяць сучаснікаў у мінулыя гады.

Медыцына

ПЛЮС ДЗІЦЯЧАЯ ПАЛІКЛІНІКА

У Ваўкавыску завяршаецца перафарміраванне медыцынскага гарадка пад міжраённы цэнтр

Пяць гадоў таму ў райцэнтры пачала дзейнічаць новая бальніца, пабудаваны новы лячэбны корпус на 260 месцаў. Тут размясціліся ўсе асноўныя аддзяленні. Цяпер на тэрыторыі бальніцы пачалася рэканструкцыя былога хірургічнага корпуса з уводам новых карпусоў пад дзіцячую паліклініку, якая ў шмат разоў павялічыць існуючыя магутнасці. Мяркуецца, што аб'ект паступіць у эксплуатацыю ў будучым годзе.

Увядзенне новага корпуса бальніцы ў 2018 годзе дазволіла не толькі палепшыць даступнасць і якасць медыцынскіх паслуг, умовы ўтрымання пацыентаў, але і аб'яднаць медыцынскую ўстанову ў адзіны цэнтр, які атрымаў статус міжраённага.

— Мы развіваемся як міжраённы цэнтр. Такіх цэнтраў у Гродзенскай вобласці тры, у тым ліку адзін у Ваўкавыску, — зазначыла **галоўны урач раённай бальніцы Алена ГРЫЦКЕВІЧ.** — У пачатку мая будзе адкрыты кабінет МРТ, зараз там вядзецца рамонт. Акрамя гэтага сёлета плануецца адкрыццё ангіяграфічнага кабінета, дзе будзе аказвацца дапамога пацыентам з вострым каранарным сіндромам. На сёння такія кабінеты ёсць толькі ў Гродне і Астраўцы.

Зараз агульная магутнасць бальніцы складае 377 ложак, дзе 56 % фонду працуе як міжраённае аддзяленне. Здзяйсняецца дапамога жыхарам іншых раёнаў і на амбулаторным этапе. Працуе цэнтр скрынінгу раку, цэнтр «Шлюб і сям'я» і іншыя аб'екты. Сучасная дыягнастычная база дазваляе праводзіць КТ-даследаванні, ультрагукавы скрынінг цяжарных жанчын з мэтай дыягностыкі прыроджанай паталогіі, працуе цыталагічная і ПЦР-лабараторыі.

Новая бальніца атрымала рэнтген-абсталяванне, ультрагукавыя прыборы. Лапараскапічная хірургія з 2021 года працуе ў рамках міжраённай дапамогі.

Цэнтральная раённая бальніца. Урач-рэнтгенолаг Дзіяна ЖМАЙЛІК і рэнтген-лабарант Ілона МАСЛОЎСКАЯ рыхтуюцца да прыёму.

— Нашы спецыялісты выязджаюць у невялікія населеныя пункты найбліжэйшых раёнаў, каб даследаваць жыхароў і прапанаваць ім лячэнне. Нават калі чалавек прыехаў сюды па справах ці ў водпуск, ён мае права звярнуцца з заявай і замацавацца за медыцынскай установай, атрымаць усе неабходныя працэдуры, якія гарантаваны дзяржавай, — паведаміла галоўны ўрач. — Мы зараз скіраваны на выкананне праграмы дыспансерызацыі, створаны дыспансерныя кабінеты. Медыцынскія сёстры на ўчастках даводзяць інфармацыю да пацыентаў.

Між тым фарміраванне медыцынскай базы працягваецца. Гаворка ідзе пра новую дзіцячую паліклініку. Зараз гэта праблемнае пытанне, бо стары корпус разлічаны ўсяго на 56 прыёмаў у змену. Вырашыць набалелае пытанне ўдалося за кошт абласной інвестыцыйнай праграмы. У мінулым годзе выдзелены сродкі на пачатак будаўніцтва, сёлета работы працягваюцца. Мяркуецца, што прымаць пацыентаў тут змогуць у будучым годзе. Магутнасці значна пашырацца. Новы аб'ект разлічаны на прыём 360 пацыентаў у змену, што ў сем разоў больш за цяперашнія магутнасці.

Дзіцячая паліклініка будуецца на тэрыторыі новага корпуса бальніцы. Такім чынам, уся лячэбная база размесціцца на адным месцы. Фарміраванне медыцынскага гарадка пашырыць медыцынскую дапамогу ў крокавай даступнасці.

ПРАДПРЫЕМСТВА ВЫСОКАГА ЎЗРОЎНЮ ВЫТВОРЧАСЦІ

У прадукцыі прадпрыемства шмат узнагарод, атрыманых на буйных айчынных і міжнародных выстаўках і кірмашах.

Кампанія «Беллакт» працуе на спажывецкім рынку больш за 50 гадоў. Гэта адзіны ў Беларусі і найбуйнейшы ў СНД вытворца сухога малочнага дзіцячага харчавання. Першая партыя ў 1970 годзе складалася з двух відаў — «Малыша» і «Малюткі». Сёння ў асартыменце толькі дзіцячых сумесяў дзясяткі відаў прадукцыі, якая з кожным годам абнаўляецца.

А хто не ведае знакамітыя «беллактаўскія» сыркі і пірожныя? Некаторыя віды сталі эксклюзіўнымі і выпускаюцца толькі тут. Зусім нядаўна іх лінейка абнавілася. Спажыўцы пачынаюць ацэньваць новыя смакі ягаднай і фруктовай калекцыі творожных сыркоў і пірожных. І, вядома, прызвычаіліся да якаснай «малочкі» — ёгуртаў, мяккіх сыроў і традыцыйных малочных прадуктаў.

Аб высокай якасці прадукцыі сведчыць безліч узнагарод. Нядаўна прадпрыемства атрымала чарговае прызнанне: прадукцыя брэнда стала лаўрэатам прэміі «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» за мінулы год.

Генеральны дырэктар Віталь ЛУПІК.

Натуральнамалочная група прадукцыі прадстаўлена папулярнымі найменнямі.

ТОЕ, ШТО ЗАМЕНІЦЬ ІМПАРТ

Як сырны цэх удасканаліць дзіцячыя сумесі

Генеральны дырэктар Віталь ЛУПІК узначальвае ААТ «Беллакт» з 2021 года. Скончыў Пінскі сельскагаспадарчы тэхнікум і Гродзенскі аграрны ўніверсітэт. Працаваў майстрам і начальнікам цэха на прадпрыемстве «Малочны мір», дырэктарам філіяла ў Шчучыне. Генеральны дырэктар лічыць, што будучыня за інавацыйнай прадукцыяй, якой тут распрацавана больш за 20 відаў.

Прадпрыемства не стаіць на месцы. Стратэгія новага кіраўніка скіравана на пашырэнне асартыменту. Гэта магчыма толькі з укараненнем новых тэхналогій. Адна з такіх ідэй — лінія на разліве малочных і фруктовых напояў. Мяркуецца, што бутэлькі будуць ад 0,5 да 2 літраў. Па словах Віталя Лупіка, такая лінія дазволіць пашырыць асартымент па малаку, кефіры, ёгуртах, дзіцячых напоях. Праўда, адбыўся збой з набыццём лініі з-за ненадзейных партнёраў. Але знайшліся варыянты з альтэрнатыўнымі пастаўшчыкамі, і ўжо ёсць дамоўленасць. Формай куплі выбралі лізінг.

Яшчэ адна лінія таксама звязаная з упакоўкай. Ёсць намер замяніць картонныя пачкі для дзіцячага харчавання бляшкамі. Гэта даўняе пытанне, з якім нарэшце ўдалося выйсці на фінішную прамую. Сумесны з турэцкай кампаніяй інавацыйны праект дапаможа ўкараніць і гнуткую вакуумную ўпакоўку дой-пак для дзіцячых сокаў і пюрэ.

— Мы працуем над дзвюма лініямі ўпакоўкі. Адна — з натуральнамалочнай прадукцыяй, другая лінія — па разліве прадукцыі з садавіны, гародніны, — удакладняе Віталь Іванавіч. — Цяпер на нашым рынку прысутнічае падобная прадукцыя ў асноўным расійскай вытворчасці.

На адным з участкаў вытворчасці.

Установка вытворчасці глазураваных сыркоў.

Навінка. Пітны ёгурт «Беллакт» са смакам манга.

Пірожныя з рознымі начынкамі і водарамі.

На словах кіраўніка кампаніі, кожнае прадпрыемства павінна ўводзіць штогод новыя віды прадукцыі. Значным фактарам з'яўляецца і адпаведная ўпакоўка. Напрыклад, сёння аддаецца перавага яркім фарбам, асабліва ў лініі дзіцячай прадукцыі. Канкурэнцыя на малочным рынку даволі значная, але на «Беллакце» ведаюць, чым прывабіць спажыўца. Вось толькі адзін з прыкладаў.

— Мы некалі запатэнтавалі вытворчасць творожных дэсертаў — тартоў, пірожных на вафлі і пячонні, што дазволіла нам заваяваць рынак практычна без канкурэнцыі. А вытворцы ведаюць, наколькі гэта складана, — нагадвае Віталь Іванавіч. — У дадзеным выпадку мы падключылі хлебазаводы, дзе пачалі вытворчасць вафлі для творожных вырабаў. Раней такі кампанент быў толькі расійскі, цяпер гэта тавар беларускай вытворчасці. Добры прыклад рэалізацыі праграмы імпартазамяшчэння. Да таго ж з'явілася нямала новых працоўных месцаў.

Хутка на «Беллакце» запусцяць на рынак яшчэ некалькі відаў прадукцыі. Якіх? Пакуль — сакрэт. Але тут запэўнілі, што гэтыя пабудаваюцца гаспадыням і значна спросцяць жыццё занятых жанчын. Пад сілу іх будзе прыгатаваць і мужчынам. А прадпрыемства мяркуе перапрацаваць яшчэ больш малака, што эканамічна выгадна.

На падыходзе — чарговы інавацыйны праект. Ідзе праектаванне новага цэха дзіцячага харчавання вытворчасцю 1400 тон на месяц. Гэта ў два разы больш за існуючыя магутнасці. А новыя ёмістасці па агульнасуветным фармацэўтычным стандарце дазволяць прадаваць сухія дзіцячыя сумесі ў любую краіну свету. У прадпрыемства нямала партнёраў. Палова прадукцыі завода ідзе на экспарт, пераважна на расійскі рынак. Але тут лічаць важным дывесіфікаваць патокі. Цяпер робіцца акцэнт на кітайскі рынак, краіны Азіі і Афрыкі.

— Нядаўна мы бралі ўдзел у выстаўцы ў Дубаі, дзе ў нас з'явіўся партнер-фармацэўт, які будзе сертыфікаваць прадукцыю на Арабскія Эміраты, Егіпет, Іран і займацца яе продажам, — расказвае дырэктар. — Ёсць дамоўленасць аб нарошчванні продажу дзіцячага харчавання ў Сірыю. Пастаўкі пачыналі з дзвюх-трох машын на месяц, па 15 тон. Цяпер, згодна з падпісаным дагаворам, работа будзе ісці на больш сістэмнай аснове.

На найбліжэйшую перспектыву ўзяты курс на імпартазамяшчэнне.

Новы кіраўнік пачаў ажыццяўленне самага буйнога праекта прадпрыемства — будаўніцтва цэха па вытворчасці цвёрдых сыроў. Сыр — сам па сабе прадукт выгадны. Але не толькі ў гэтым яго каштоўнасць. Вытворчасць дасць магчымасць атрымліваць лактозу — важны кампанент для дзіцячага харчавання. Акрамя таго, імпартазамяшчэнне паўплывае і на цанавы фактар.

— Штомесяц мы закупляем 200 тон лактозы ў Польшчы, бо без гэтага кампанента дзіцячага харчавання не будзе. Плюс нам штомесяц патрабуецца 45 тон канцэнтрату сыроваткі нага бялку. Гэты важны кампанент таксама прыходзіцца закупляць. А калі мы ўвядзём сырны цэх, мы зможам усю сыроватку рабіць самі. Гэта дасць магчымасць замяніць 200 тон лактозы і 45 тон бялку сваёй сыроваткі. Імпартазамяшчэнне дазволіць знізіць кошт дзіцячага харчавання на 16 % і пазбегнуць залежнасці ад польскага пастаўшчыка, — робіць расклад будучых перспектыў Віталь Іванавіч.

А яны, перспектывы, не такія і далёкія. Справа не стаіць на месцы. Цяпер рыхтуецца дазвол на праектаванне. Новая вытворчасць з'явіцца побач з існуючым прадпрыемствам — тэрыторыя дазваляе. Гэта будзе даволі вялікі сучасны комплекс, аб чым сведчыць яго кошт — да 30 мільёнаў еўра. Тут плануюць перапрацоўваць да 900 тон малака ў месяц. Гэта той аб'ём, які патрэбны для замяшчэння кампанентаў дзіцячага харчавання. Вядома ж, і сам сыр — гэта ўжо перапрацаваны прадукт. А яго прадаж значна выгаднейшы, чым продаж сыравіннай прадукцыі. Значны плюс новай вытворчасці яшчэ і ў дадатковых працоўных месцах. А іх плануецца стварыць каля сотні.

ІНАВАЦЫІ ДЛЯ НЕМАЎЛЯТ

Прэбіётык па аналогіі груднога малака для падтрымкі імунітэту

Брэнд «Беллакта» — гэта малочныя сумесі для дзяцей з самага іх нараджэння. У 2001 годзе прадпрыемства ўключана ў праграму «Дзеці Беларусі». У 2010-м — завершана мадэрнізацыя абсталявання па выпуску дзіцячага харчавання. Неаднаразова ААТ «Беллакт» выходзіла пераможцам спажывецкай прэміі «Народная марка». А гэта, безумоўна, сімвал даверу і папулярнасці прадукцыі ў пакупнікоў.

Галоўны тэхнолаг прадпрыемства Таццяна НОВІКАВА.

Брэнд у лінейцы дзіцячых сумесяў вядомы ўжо больш за паўстагоддзе. На гэтай прадукцыі выраслі не адно пакаленне беларусаў, але не толькі, бо прадпрыемства ўваходдзіла ў саюзны канцэрн у ліку чатырох аналагічных заводаў. Дзіцячыя сумесі пастаўлялі з «Беллакта» ва ўсе куткі былога Саюза. Але толькі ваўкавыскае прадпрыемства здолела захаваць напрацаваную лінейку прадукцыі. І не проста захаваць, але і значна яе абнавіць. За гэты час асвоены сотні новых відаў прадукцыі. Дзіцячыя сумесі займаюць галоўнае месца ў асартыменце. Прадпрыемства — адзінае ў Беларусі па выпуску ўсіх сумесяў ад нараджэння да года і старэйшых. У асартыменце — сумесі для здаровых дзяцей, лячэбныя, сумесі на частковай гідралізацыі сыраваткавага бялку.

— Прадукты дзіцячага харчавання мы распрацоўваем самі з удзелам навукі, — як беларускай, так і расійскай. У гэтым нам дапамагае наш інстытут мясамалочнай прамысловасці Акадэміі навук Беларусі і расійскі Інстытут дзіцячага харчавання, які знаходзіцца ў горадзе Істра. Днямі прадстаўнікі інстытута пабывалі ў нас на прадпрыемстве, каб абмеркаваць магчымасці энтэральнага харчавання. Таксама нашы супрацоўнікі пастаянна ўдасканальваюць свае навыкі — на семінарах, сімпозіумах, з'ездах — каб быць у курсе апошніх інавацый у дзіцячым харчаванні. Як толькі з'яўляецца новы кірунак у вытворчасці дзіцячых сумесяў, мы ўключаем новыя кампаненты, — адзначае **галоўны тэхнолаг ААТ «Беллакт» Таццяна НОВІКАВА.**

Напрыклад, летась у склад новых дзіцячых сумесяў тут увялі прэбіётык — аналаг грудному малаку. Ён дапамагае ўмацаваць імунітэт пры штучным кармленні і з'яўляецца гіпаалергенным інавацыйным прадуктам. Прэбіётык папяпшае якасны склад прадукту, яго біялагічную і спажывецкую каштоўнасць.

На прадпрыемстве часта запрашаюцца ўрачы-педыятры, якія маюць магчымасць ацаніць узровень вытворчасці сумесяў, кантроль і бяспеку. Асаблівая ўвага ў гэтым аддаецца сыравіннай зоне.

— Гэта гаспадаркі, якія знаходзяцца ў спецыяльным рэестры, зацверджаным Міністэрствам сельскай гаспадаркі Беларусі. На вытворчасць дзіцячай прадукцыі мы можам браць малако толькі адтуль. Фермы, якія знаходзяцца ў наваколлі Белавежскай пушчы, праходзяць асобную акрэдытацыю. Там вельмі жорсткія паказчыкі бяспекі і асаблівыя патрабаванні. Сыравіна павінна быць экалагічна чыстай.

Дарэчы, галоўны тэхнолаг прадпрыемства Таццяна Новікава на сёлетнім VIII Міжнародным форуме «Беларусь малочная» ўзнагароджана дыпломам за стварэнне інавацыйнай прадукцыі для харчавання немаўлят.

ЖЫЛЛЁ, БАСЕЙН І... АНСАМБЛЬ ААТ «БЕЛЛАКТ»

На прадпрыемстве клапоцяцца не толькі аб прыбытках, але і аб камфорце супрацоўнікаў

Дарэчы, камфорт тут відаць няўзброеным вокам. У вочы кідаецца сучасны рамонт як фасада, так і ўнутраных памяшканняў. Прыгожа і стыльна. Але гэта, вядома, не самае галоўнае. Больш уражваюць сацыяльныя аб'екты. І ў першую чаргу медпункт з найноўшай стаматалагічнай устаноўкай, масажнае крэсла, фізіятэрапеўтычнае абсталяванне, дзе пасля работы можна атрымаць неабходную медыцынскую рэабілітацыю. Прыгожа афармлена сталовая.

Як расказала **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце Вольга ГАЛАСКОК**, на балансе прадпрыемства знаходзіцца база адпачынку, фізкультурна-аздараўленчы комплекс з басейнам. Прадстаўнікі «Беллакта» ўдзельнічаюць у раённых, абласных, рэспубліканскіх спаборніцтвах. Згодна з калектыўным дагаворам, удзел у грамадскім жыцці, спартыўных і культурных мерапрыемствах заахвочваецца матэрыяльна. Створаны каманды па міні-футболе, баскетболе, валейболе, стральбе, настольным тэнісе. Нядаўна ўзялі ўдзел у раённым аглядзе-конкурсе, праводзілася свая спартландыя з удзелам сямі камандаў прадпрыемства. Пераможцы атрымалі прызы і падарункі. Так што вольны час праходзіць даволі змястоўна.

— На прадпрыемстве працуе каля паўтары тысячы чалавек, шмат маладых спецыялістаў. Усе іншагароднія забяспечаны жыллём. Кожны малады спецыяліст мае вопытнага работніка-настаўніка, — звяртае ўвагу Вольга Уладзіміраўна.

Сучаснае масажнае крэсла — адна з навінак медабсталявання.

Работнікі прадпрыемства маюць магчымасць умацоўваць здароўе ў басейне, атрымліваць кваліфікаваную лячэбную дапамогу ў сваім здраўпункце.

Яна расказала яшчэ аб адной цікавай ініцыятыве.

— Летась мы правялі конкурс «Алё, мы шукаем таленты!», на якім выявілі каласальную колькасць нашых таленавітых супрацоўнікаў. Менавіта з іх удзелам у нас праходзяць усе святочныя мерапрыемствы. Цяпер канцэртная праграма складаецца сіламі нашых супрацоўнікаў. І гэта выклікае вельмі шырокі інтарэс усіх работнікаў прадпрыемства. Народ, што называецца, валам валіць, каб паглядзець на сваіх артыстаў. На такія канцэрты людзей збіраецца не менш, чым на выступленні знакамітасцяў, — заўважае ідэолаг прадпрыемства.

Дарэчы, у рамках нядаўняга форуму «Беларусь малочная» адбыўся і конкурс сцэнічнага майстэрства, на якім вакальна-інструментальны ансамбль «Беллакта» ўзнагароджаны дыпломам лаўрэата III ступені. Яго ўдзельнікі выступілі з аўтарскай песняй «Наш «Беллакт».

Медсястра Марына ПАНАСІК і ўрач-тэрапеўт Наталля САВАНОВІЧ рыхтуюцца да прыёму наведвальнікаў.

ІНФ 10004/3003

Кажуць, лепш адзін раз убачыць, чым сто раз пачуць. Калі адносіш гэтую фразу да Ваўкавыскага мясакамбіната, яна можа гучаць так: «Лепш адзін раз пакаштаваць, чым сто раз... пачуць, убачыць і гэтак далей». Можна без перабольшання сказаць, што тут усё арыентавана на смак. І гэта дае свой плён. Мясныя вырабы прадпрыемства атрымліваюць высокія ўзнагароды на спажывецкіх конкурсах краіны і за мяжой на працягу многіх дзесяцігоддзяў. Вось і сёлета сюды адправіўся Гран-пры рэспубліканскага конкурсу «Прадукт года — 2022» за сервелат «Швейцарскі з сырам». Больш за тое, прадпрыемства заваявала першыя месцы яшчэ ў пяці важных намінацыях: вараныя каўбасы, сасіскі і сардэлькі, мясныя далікатэсы, паўфабрыкаты, сыравэнджаныя і сыравяленыя каўбасы.

Расфасоўшчык Мікіта ГЛУШЭНЯ абслугоўвае абсталяванне для вакуумнай упакоўкі прадуктаў.

Складанне фаршу даручана аператару Дзмітрыю АСТАПЧУКУ.

Генеральны дырэктар Вольга ЯНУШКА.

ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат»:

ДЛЯ ТЫХ, У КАГО ЁСЦЬ ГУСТ

Як прадпрыемства з амаль 60-гадовай гісторыяй аднаўляе пазіцыі

Начальнік каўбаснага цэха Наталля ДАДАЦКАЯ.

Вядома ж, працуюць тут не дзеля ўзнагарод. Хоць дадзены фактар сведчыць аб высокім узроўні прадукцыі. У першую чаргу прадпрыемства робіць стаўку на спажыўцоў — гараджан, вяскоўцаў, людзей рознага ўзросту і розных густаў. З упэўненасцю можна сказаць, што кожны можа знайсці ў асартыменце не адзін від патрэбнай, а галоўнае, вельмі якаснай прадукцыі.

А як жа інакш! Менавіта бяспека і якасць — самыя лепшыя гаранты іміджу прадпрыемства. Сістэма менеджменту якасці адпавядае ўсім міжнародным стандартам.

ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат» на працягу дзесяцігоддзяў з'яўляецца адным з самых высокатэхналагічных і інавацыйных мясакамбінатаў Беларусі. За мінулы год тут было запушчана звыш 60 найменняў новай прадукцыі — і гэта, здаецца, не мяжа.

Наогул тут вырабляецца каля 300 найменняў мясной прадукцыі. Трэцяя частка — паўфабрыкаты. У іх ліку такі папулярны прадукт, як пельмені. Гандлёвыя сеткі бяруць іх на рэалізацыю з ахвотаю. З улікам попыту прадпрыемства вырабляе больш за 10 тон пельменяў у суткі. А яшчэ прадпрыемства пастаўляе на спажывецкі рынак мяса і субпрадукты, розныя віды каўбасных вырабаў і вяндліны, паштэты, паўфабрыкаты розных відаў, фаршы, катлеты, пельмені і варэнікі.

Наталля ЯНУШКЕВІЧ, Сцяпан ПІВАВАР, Анастасія ГРЫНЬКО праводзяць разборку субпрадуктаў.

ШТО ТОІЦЬ НОВЫ БРЭНД ПРАДПРЫЕМСТВА?

Сёння можна казаць аб новым этапе развіцця мясакамбіната. І звязана гэта ў значнай ступені з прыходам новага кіраўніка. У 2021 годзе генеральным дырэктарам ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат» прызначана Вольга ЯНУШКА. Вольга Васільеўна па адукацыі інжынер-тэхнолаг, скончыла Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны універсітэт. Сваю працоўную дзейнасць пачала ў 2003 годзе на Слонімскім мясакамбінаце. За 18 гадоў прайшла шлях ад апрацоўшчыка каўбасных вырабаў да намесніка дырэктара па вытворчасці. Менавіта вольт работы ў галіне дапамагае маладому кіраўніку рабіць захады па ўдасканаленні і прэзентацыі прадукцыі. А планы, як аказалася, істотныя.

— Вольга Васільеўна, у першую чаргу хочацца даведацца, з чым звязана змена вашага лагатыпа? Чаму пайшлі на такі крок?

— Летась мы правялі рэбрэндынг прадпрыемства, каб павысіць лаяльнасць пакупніка да нашай гандлёвай маркі. Вырашылі, што ён павінен быць больш простым, даступным для вока і ўспрымання. Папярэдні лагатып, я лічу, быў занадта складаны. А мы бачым, што трэба прыцягнуць да нашага брэнда больш маладую аўдыторыю, якая, як вядома, не імкнецца асабліва абцяжарвацца. Спадзяёмся, што гэтая прастата будзе ўспрынята станоўча.

— Што сімвалізуе новы лагатып?

— Мы захавалі ў назве спасылку на Ваўкавыскі мясакамбінат — гэта літары В і М. З лагатыпам звязаны і наш новы слоган: «Слухай свае жаданні». Мы размаўляем з нашым спажыўцом так: «Вы хочаце смачна есці? Мы можам вам гэта даць! Вам патрэбен шырокі асартымент высокай якасці? Калі ласка, Ваўкавыскі мясакамбінат можа гэта зрабіць».

— У вас вельмі цікавая прэзентацыя прадпрыемства ў сацыяльных сетках, у прыватнасці «Інстаграме». Асабліва звяртае на сябе ўвагу прадукцыя з рэцэптамі, і яны даволі арыгінальныя.

— У нас створана свая група, якая рыхтуе ролікі для «Цік-Тока». І людзям тое цікава. Яны хочуць бачыць прадукт і што з яго можна прыгатаваць. Нашы рэцэпты выклікалі вялікі інтарэс. Цяпер мы вырашылі пайсці далей і паказаць саму вытворчасць, каб усе бачылі, што мы адкрытыя для пакупніка і нічога не ўтойваем. Напрыклад, пакажам у ролику, як робіцца вараная каўбаса, як кладзецца натуральнае мяса, спецыі. Мы нічога не хаваем, каб давер да брэнда быў максімальны. Гэта відавочна павышае продаж і лаяльнасць спажыўца.

— Новы асартымент расце? Можа з'явіўся нейкі асаблівы прадукт?

— Пры распрацоўцы новых прадуктаў мы ўлічваем, як мяняецца рынак. Нядаўна запусцілі лінейку стэйкаў — цяпер гэта папулярны напрамак. Таксама распрацавалі паўфабрыкаты хуткага гатавання — філе, грудзінка, шынка, рэбры. Пашырылі асартымент шашлыкоў з рознымі марынадамі.

Таксама мы працуем над упакоўкай. У нас сёлета запланавана 8 мільёнаў інвестыцый на згаданы праект, закупім тэхналагічнае абсталяванне. Прадукцыя будзе паступаць на прылавак у індывідуальнай упакоўцы. Гэта нарэзка, вэнджаніна па 200-300 грамаў і іншае. Летась мы пашырылі асартымент фіксаваній вагі каўбас і сасісак у вакуумных упакоўках. Сёння няма дэфіцыту прадукцыі, цяпер прадукцыі багата. І чым можна здзівіць пакупніка? Толькі сэрвісам, воннакавым выглядам і якасцю.

— Экспарт не пацярпеў з-за санкцый?

— Я не сказала бы, што на нас адбіліся санкцыі. За мінулы год мы павялічылі экспарт на 130 % у параўнанні з папярэднім. У нас 9 краін-партнёраў, маем сертыфікат «Халяль» для пастаўкі ва ўсходнія краіны.

Асноўныя нашы рынкі — Расійская Федэрацыя, Узбекістан, Кітай. Але доля расійскага рынку ў мэтах дывэрсіфікацыі паступова змяншаецца і цяпер займае толькі 20 %. Мы не засяроджваемся на адным напрамку, наадварот, пашыраем геаграфію паставак, і чым больш краін, тым больш упэўнена будзе адчуваць сябе прадпрыемства.

— Налета ў прадпрыемства юбілей — 60 гадоў. З якімі вынікамі збіраецеся падысці?

— Прадпрыемства працуе стабільна, з прыбыткам. Але трэба быць мабільнымі, бо рынкі мяняюцца. Галоўнае — захаваць калектыў. Сёння на камбінаце працуе 1200 чалавек. Калі я прыйшла на прадпрыемства, у нас было 200 вакансій, людзей не хапала. Летась мы паднялі на 37 % тарыфную стаўку, адпаведна, адбыўся і рост зарплаты, у сярэднім яна складае каля 1700 рублёў. Павялічыўся сацыяльны пакет, работнікі складаных участкаў прэтэндуюць на льготную пенсію. Цяпер амаль усе вакансіі занятыя.

Планы грандыёзныя — пашыраць вытворчасць, асартымент, мадэрнізавацца.

— Вам як маладой жанчыне не складана кіраваць такім буйным прадпрыемствам?

— Я люблю сваю работу, хоць яна вельмі адказная. Але я бачу, што калектыў давярае мне, у нас вельмі добрая каманда. Гэта важны стымул для таго, каб ісці наперад. І першыя крокі паказалі, што мы выбралі правільны кірунак.

«Сярод найбольш папулярных вырабаў — сыравяленая каўбаса «Каралеўская новая», — адзначыла майстар каўбаснага цэха Святлана КЛІМЧУК.

Тэрмаапрацоўкай прадукцыі занятая апаратчыца Тэрэза ПАМІЛЬКА.

КАЎБАСНЫ ЦЭХ. ЯК ГЭТА ПРАЦУЕ

Трэба сказаць, каўбасы займаюць даволі значны аб'ём вытворчасці камбіната — іх выпускаюць 60 тон у суткі. Як расказала **начальнік цэха Наталля ДАДАЦКАЯ,** толькі сасіскак тут выпускаюць да 7 тон, а вараных каўбас і наогул 20-23 тоны.

У каўбасным цэху некалькі ўчасткаў. Але больш за ўсё ўражвае камера сушкі вэнджаных каўбас. Здаецца, што тут іх безліч. Увесь працэс вакуумнай апрацоўкі аўтаматызаваны, зададзены адпаведныя параметры. Пасля сушкі каўбасы паступяць на лінію-аплікатар, дзе будуць аздоблены прыгожымі этыкеткамі з лагатыпам. Абсталяванне закуплена ў мінулым годзе.

Дык чаму ваўкавыскія каўбасы такія смачныя? У чым тут сакрэт? Сакрэт ёсць, упэўнены **Дзмітрый АСТАПЧУК**, які якраз і складае фарш для каўбас. Вось толькі раскрываць яго ён не спяшаецца, ды і навошта, калі прадукт падабаецца? Як відаць, тут закладваецца яшчэ і добры настрой. Бо работу сваю Дзмітрый выконвае з ахвотай, кажа, што яму падабаецца. За 10 гадоў набыў пэўны вопыт, пасябраваў з калектывам. Прызнаецца, што спачатку былі думкі паехаць працаваць за мяжу, але з цягам часу зразумеў, што хоча жыць у сваім родным горадзе. Тут у яго сям'я, дом, работа, прыстойная зарплата.

Дзякуючы такім людзям, як работнікі ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат», забяспечваецца харчовая бяспека нашай краіны.

ГАРАНТ БЯСПЕКІ І ЯКАСЦІ

Пра тое, які кантроль праходзіць прадукцыя прадпрыемства, расказала загадчыца лабараторыі Ларыса БЕЙ:

— Наша лабараторыя — вельмі важная частка вытворчага працэсу. Пад кантролем літаральна ўсё — абалонка, сыравіна, абсталяванне і самі вырабы. Кантроль штодзённы. Правадзяцца арганалептычныя, фізіка-хімічныя іспыты, мікрабіялагічныя, радыялагічныя аналізы, а таксама даследуем імунаферментным аналізам астаткавае ўтрыманне антыбіётыкаў. Для таго каб зрабіць санітарна-гігіенічныя даследаванні, бяруцца змывы з абсталявання, а таксама тары, рук, інструменту. Вядзецца кантроль спецый і абалонкі.

У нас гатовая прадукцыя да выбракоўвання не даходзіць. Калі ёсць парушэнні нормаў, тое выпраўляецца на першай стадыі. Кантроль сыравіны і матэрыялаў праводзіцца з тым разлікам, каб не дапусціць спынення вытворчасці.

Бактэрыёлаг Алена ГРЫГУЦЬ.

Хімік вытворчай лабараторыі Таццяна МАЙРЫНА.

Побач з прадпрыемствам размясцілася адна з фірменных крам Ваўкавыскага мясакамбіната.

Загадчыца фірменнай крамы Святлана ПАТРЭБА *(другая злева)* і прадаўцы Таццяна БАКАЧ, Валянціна ПЯНЬКОЎСКАЯ, Таццяна ЧАРНЕЎСКАЯ.

ДЗЕ СПРАЎДЖВАЮЦЦА МАРЫ

Такія месцы — фірменныя крамы ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат». Іх у прадпрыемства каля 20 у розных рэгіёнах Беларусі. Тут рэалізоўваецца каля 17 % прадукцыі, гандлёвую сетку мяркуюць пашыраць. Па словах **загадчыцы ваўкавыскай крамы «Бальчык» Святланы ПАТРЭБЫ**, вялікі асартымент асабліва здзіўляе гасцей горада. Не праходзіць міма і мясцовыя жыхары. Яны купляюць у асноўным мяса, фарш, паўфабрыкаты. Вядома, ж карыстаюцца попытам каўбасы, рулеты, паштэты, палянд-віцы, вэнджаныя і вялёныя каўбасы і іншыя далікатэсы. Пастаянна з'яўляюцца новыя віды прадукцыі. У летні сезон, кажа Святлана, добра разыходзяцца каўбаскі, шашлыкі для пікнікоў. Падчас школьных канікулаў расце попыт на вараныя каўбасы, сасіскі, на святы попыт узрастае на ўсю прадукцыю.

Святлана раіць абавязкова зайсці ў «Інстаграм» і прыгатаваць з вырабаў камбіната стравы, якія могуць стаць унікальнымі на святочным стале. Вядома, у меню ёсць і простыя стравы, якія гатуюцца хутка і прытым вельмі смачныя. Галоўнае — скарыстаць інгрэдыенты менавіта ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат».

УНП 500010152

Маргарыта УШКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

З МАКІЯЖАМ І ДОБРЫМ НАСТРОЕМ

Як жанчыны на складаных участках спрацоўваюцца са спецыфічнай работай

Мясакамбінаты — прадпрыемствы, дзе нават пры высокай аўтаматызацыі не абысціся без ручной працы, якую выконваюць і жанчыны. Усе аперацыі яны праводзяць спрытна і дакладна.

Наталля ЯНУШКЕВІЧ працуе на разборцы субпрадуктаў 15 гадоў. Звяртае на сябе ўвагу не вонкавы выгляд — прыгожая ўсмешлівая жанчына з макіяжам і, па ўсім відаць, з добрым настроем. Ці не цяжка жанчыне тут працаваць?

— У нас вельмі дружны калектыў, і вы самі бачыце, што многія нашы жанчыны так выглядаюць: сочаць за сабой, застаюцца прыгожымі нават на вытворчых месцах. У нас склаўся даволі стабільны касцяк, многія працуюць па 20 і больш гадоў. З прыходам новага дырэктара ёсць змены ў лепшы бок. Вядзецца рамонт, тэрыторыя стала добраўпарадкаванай, больш зеляніны, кветак. Што датычыцца ўмоў працы, яны такія, якія павінны быць на гэтым участку. Усё, што трэба, нам дадзена, — запэўніла Наталля.

А вось у **Тэрэзы ПАМІЛЬКІ** стаж ажно 35 гадоў. Яна — апаратчыца тэрмаапрацоўкі субпрадуктаў. Кажа, што зарплата апошнім часам выраслa і нават вышэйшая, чым на іншых прадпрыемствах горада. Менавіта з-за заробку яна і прыйшла калісьці на камбінат. І не шкадуе.

— Ад прадпрыемства атрымала пазыку для ўнёску на кватэру, і гэта было вельмі дарэчы, — расказвае жанчына. — Таксама нам даюць сертыфікаты на сваю прадукцыю, сацыяльны пакет даволі значны.

На прадпрыемстве працуе і яе дачка Вольга. Яна па сямейных абставінах пераехала ў Ваўкавыск, і маці параіла ёй уладкавацца на камбінат. Цяпер працуе кладаўшчыцай, але маці спадзяецца, што дачка, якая мае вышэйшую адукацыю, зробіць тут кар'еру.

Генеральны дырэктар Уладзімір КІСЯЛЁЎ.

ПРАДПРЫЕМСТВА працуе больш за 100 гадоў. Напачатку тут выпускалі толькі цэмент. Паступова ўводзіліся новыя лініі, вялася замена абсталявання на больш эфектыўнае. Значныя зрухі пачаліся з 2000-х гадоў, калі сталі ўкараняцца энергазберагальныя тэхналогіі і пашырыўся асартымент. З'явіўся ўчастак па выпуску каляровай тратуарнай плітак, адкрыўся цэх па вытворчасці сухіх будаўнічых сумесяў, гідратнай вапны, блокаў з ячэістага бетону. Дзесяць гадоў таму была запушчана новая тэхналагічная лінія па вытворчасці клінкеру сухім спосабам. Сёлета рэалізавана некалькі энергазберагальных праектаў, якія дазволілі знізіць затраты на спажыванне газу.

Прадукцыя ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» — у ліку лаўрэатаў штогадовага конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь».
У сакавіку названы пераможцы конкурсу за 2022 год. Прадпрыемства прызнана найлепшым у намінацыі «Прадукцыя вытворча- тэхнічнага прызначэння». Лаўрэатамі сталі тры віды прадукцыі завода. Гэта портландцэмент ЦЕМ I 42,5Н ГОСТ 31108-2020, вапна будаўнічая парашковая гідратная без дабавак II сорту ГОСТ 9179-2018 і тынкавы раствор для ўнутраных работ 223-30 СТБ 1307-2012.

ААТ «Краснасельскбудматэрыялы»:

НОВЫЯ СТРАТЭГІІ НАЙСТАРЭЙШАГА ПРАДПРЫЕМСТВА

СТАЎКА НА МАДЭРНІЗАЦЫЮ І ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЕ

Уладзімір КІСЯЛЁЎ, генеральны дырэктар ААТ «Краснасельскбудматэрыялы»:

— Прадпрыемства ў поўнай ступені задавольвае патрэбы ўнутранага рынку. І аб'ёмы яго з кожным годам растуць. У 2022-м дасягнуты рост аб'ёму прадукцыі ў адпускных цэнах у памеры 109,1 % да ўзроўню 2021 года. На 110,3 працэнта вырасла выручка ад рэалізацыі прадукцыі і за мінулы год склала амаль 400 мільёнаў рублёў.

У мінулым годзе ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» выканаў усе паказчыкі дзяржаўнай падтрымкі. У мэтах павышэння эфектыўнасці вытворча-гаспадарчай дзейнасці, аптымізацыі затрат пры вытворчасці прадукцыі рэалізуюцца мерапрыемствы па снiжэнні яе сабекошту. Гэта прымяненне высокаалюмінатнай уласнай гліны пры вытворчасці клінкеру, што зніжае ўвоз імпартнага попелу на 4,5 млн рублёў. На 2,7 млн рублёў атрымалася эканомія ад прымянення акаліны пры вытворчасці клінкеру замест замежнай руды. Значная эканомія атрымана ад прымянення альтэрнатыўнага паліва, у тым ліку зношаных шын. Эканамічны эфект ад рэалізацыі дадзеных мерапрыемстваў склаў за мінулы год 14,8 млн рублёў.

На прадпрыемстве рэалізуюцца праекты, якія дазваляюць знізіць затраты ў энергетычным кірунку. Сёлета запусцілі цеплагазагенератар для сушкі сыравіны. Абсталяванне ў асноўным працуе на торфе, што замяняе 30 мільёнаў кубоў газу ў год. Калі тонна ўмоўнага паліва каштуе 500 рублей, то торфу — 210, гэта значны эканамічны эфект. Да таго ж мы запусцілі лінію па выкарыстанні RDF-паліва. Гэта дасць магчымасць знізіць сабекошт і павысіць канкурэнтаздольнасць на рынках. І будзем далей рухацца па праграме імпартазамяшчэння. Падлічылі, што гэта дасць добры эфект.

Ідзе распрацоўка новых відаў прадукцыі. Удзельная вага адгружанай інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме складае 11,4 %. У 2022 годзе рост інвестыцый у асноўны капітал склаў 115,5 % да ўзроўню папярэдняга года. Дасягнуты рост заработнай платы ў памеры 126,7 %.

За працэсам абпальвання назірае абпальшчык Андрэй СОХАНЬ.

Адсюль ідзе кантроль і кіраванне складанымі вытворчымі працэсамі.

На ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» выпускаецца да 15 відаў цэменту, 35 рэцэптур сухіх будаўнічых сумесяў, у тым ліку тынкавыя, сыжка для падлогі і грунтоўкі, гідраізаляцыйныя растворы, клей для плітак, шпатлёўка, сем відаў будаўнічай вапны, два віды крэйды. У асартыменце — прадукцыя з ячэістага бетону, сілікатны камень і цэгла, тратуарная плітка рознай формы, фундаментныя блокі і іншая прадукцыя, неабходная ў будаўніцтве.

«МАЛЬДЗІВЫ» І СТАРАЖЫТНЫЯ ШАХЦЁРЫ

На прадпрыемстве распрацаваны свой турыстычны маршрут, які ўключае знаёмства з вытворчасцю, наведванне музея і аглядальнай пляцоўкі на адной з крэйдавых лінзаў. Захаваліся і шахты, дзе здабывалі крэмній першабытныя людзі. **Афарміцель музея Таццяна ВАСІЛЕВІЧ** расказала аб самых цікавых экспанатах. Гэта крэйдавыя адбіткі дагістарычных марскіх насельнікаў — двухстворкавага малюска, пектуса, марскіх вожыкаў, ракавіны галаваногіх малюскаў аманітаў. А самаму старажытнаму экспанату — адбітку рыбы віду Хаплаптэрыкс — больш за 60 мільёнаў гадоў. Дарэчы, знайшлі гэты адбітак у 2004 годзе падчас работы на крэйдавым кар'еры. Тут можна разглядзець луску, плаўнікі і вачніцы рыбы. Сапраўднасць гэтага віду была ўстаноўлена навукоўцамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У музеі прадпрыемства можна ўбачыць макет шахты, дзе ў далёкія часы мясцовыя жыхары здабывалі крэмень.

Працэс выпуску цэменту звязаны са здабычай крэйды ў кар'ерах, якія пасля эксплуатацыі запаўняюцца вадой. Ад крэйды вада набывае бірузовы колер, а самі кар'еры ў народзе атрымалі назву «беларускія Мальдзівы». Гэта зона заўсёды вабіла экстрэмалаў і амататараў фотасесій, хоць і была забаронена для наведвальнікаў. Але нядаўна на схіле распрацаванай дзесяць гадоў таму лінзы абсталявана аглядальная пляцоўка. Цяпер рабіць фота на фоне грандыёзнага кар'ера стала бяспечна. Пляцоўка добра замацавана, забетанiравана і агароджана.

— Мы працуем з арганізаванымі групамі, паказваем завод, наш музей, потым едзем сюды, на пляцоўку, бо турыстаў цікавіць і наша вытворчасць, і нашы знакамітыя «Мальдзівы», — расказаў **намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце і сацыяльных пытаннях Генадзь НАЙДЗЮК.** — Гэта была ўязная дарога ў кар'ер. Часткова дарога засталася. Мы крыху ўзняліся бетоннаю частку, каб адкрываўся лепшы від. Паставілі знакі. Месца вельмі прыгожае, маштабнае, праглядаецца амаль увесь кар'ер з маляўнічай панарамай.

«На нашых «Мальдзівах» абсталявана пляцоўка, з якой можна любавацца рэдкасным краявідам», — кажа намеснік гендырэктара па ідэалагічнай рабоце і сацыяльных пытаннях Генадзь НАЙДЗЮК. Тут ужо размешчана і неабходная інфармацыя для наведвальнікаў.

СЭРЦА ПРАДПРЫЕМСТВА — ЦЭМЕНТНЫ ЗАВОД

Гэта, можна сказаць, нашчадак таго першага завода, які быў пабудаваны амаль 110 гадоў таму і пазней атрымаў назву «Перамога». Цяпер стары завод не дзейнічае, але некалькі яго карпусоў стаіць. Кажуць, што сюды прыязджаюць здымаць кіно. А новы завод пабудаваны з улікам сучасных тэхналагічных і экалагічных параметраў. Цяпер гэта філіял № 1 ААТ «Краснасельскбудматэрыялы».

Новая лінія па выпуску цэменту сухім спосабам пабудавана крыху больш за 10 гадоў таму ў рамках беларуска-кітайскага праекта. Па ёй падаецца сухая сыравінная мука, якая значна хутчэй абпальваецца. Вытворчасць павялічылася больш чым у чатыры разы.

— Мы знаходзімся на цэнтральным пульце кіравання. Адсюль ідзе кіраванне ўсім працэсам: ад падачы сыравіны да вытворчасці клінкеру. Клінкер — гэта паўфабрыкат цэменту. Вытворчасць клінкеру пачынаецца з цэха перапрацоўкі сыравіны. Сумесь у мльне ператвараецца ў сыравінную муку, з якой потым у працэсе абпальвання атрымліваецца клінкер. Ён абпальваецца вугалем, яго мелюць у вугальным млыну цэху паліва. Газ практычна не выкарыстоўваецца, толькі на некаторых працэсах, — расказвае **дырэктар філіяла Анатоль ІГНАТОВІЧ.**

На цэментным філіяле ўстаноўлены той самы цеплагазагенератар, які працуе на торфе і дазваляе замясціць да 150 тысяч кубоў газу ў суткі. Тут размясцілася і лінія па спальванні RDF-паліва, дзе ўстаноўлена сучасная драбілка, з дапамогай якой ідзе драбненне альтэрнатыўнага паліва, аб'ёмы якога будуць пашырацца.

Дарэчы, увесь працэс можна ўбачыць на маніторах, за якімі сочаць аператары. Напрыклад, **Аляксандр МУХА** кіруе працэсам з аўтаматычнага пульта. Увесь працэс кампʼютарызаваны: ад падачы сыравіны да сушкі і млына. Праграма закладзена з самага пачатку работы новай лініі, але патрабуе ўвагі, кажа Аляксандр. На гэтай аперацыі ён працуе 10 гадоў і добра асвоіў усе нюансы і асаблівасці працэсу.

Тэхнолаг Наталля ВІШНЕЎСКАЯ сочыць за тым, каб гэты працэс не парушаўся і ўсе прапорцыі кампанентаў адпавядалі нормам. У лабараторыі ўся сыравіна, як і канчатковы прадукт, праходзіць адпаведны аналіз хімрэактывамі.

Кантроль якасці сыравіны і гатовай прадукцыі праводзяць супрацоўнікі лабараторыі. Лабарант хімічнага аналізу Ларыса СЦЯЦЭВІЧ — адна з тых, хто заняты гэтай адказнай справай.

МЛЫНАР МЕЛЕ... ВАПНУ

«Спартыўны інтэрнат — гэта незаменная рэч для падрыхтоўкі маладых спартсменаў. Без яго нічога б у нас не атрымалася. У інтэрнат мы набіралі негатовых, але таленавітых дзяцей, і там яны выраставалі ў моцных спартсменаў. Праўда, мне даводзілася быць ім і за трэнера, і за выхавацеля, і за бацькоў», — адзначае **адзін з пачынальнікаў беларускага гандбола Віктар KACIHCKI,** які на працягу некалькі дзесяцігоддзяў выхоўваў чэмпіёнаў. Віктар Пятровіч — у гандболе, яго калегі — у іншых відах спорту, разам — у вучылішчы алімпійскага рэзерву. За 50-гадовую гісторыю спартыўны інтэрнат, а пасля вучылішча алімпійскага рэзерву адкрыла дарогу на Алімп тысячам беларускіх спартсменаў.

Да 1966 года адзінай і асноўнай вучэбнай установай спартыўнай накіраванасці ў Беларусі быў інстытут фізкультуры. Са сваімі задачамі ён спраўляўся, але інтарэс насельніцтва да спорту павялічваўся, галіна патрабавала да сябе ўсё больш увагі. У 1966 годзе ў адпаведнасці з загадам Міністэрства асветы БССР на базе школы-інтэрната № 7 горада Мінска па адрасе вуліца Тарханава, 20 (пазней гэтую вуліцу ў сваіх інтэрв'ю будуць згадваць многія беларускія чэмпіёны) была заснавана Рэспубліканская агульнаадукацыйная школа-інтэрнат са спартыўнай накіраванасцю. Тут былі створаны неабходныя ўмовы, каб маладыя людзі маглі атрымліваць сярэднюю адукацыю і трэніравацца ў спрыяльным спартыўным рэжыме. У 1987 годзе на вуліцы Філімонава быў уведзены ў строй другі вучэбны корпус школы-інтэрната са спартыўнымі заламі і сталовай. Гэтая база і стала сэрцам Рэспубліканскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву. За 50 гадоў змянілася многае, была здасканалена сістэма падрыхтоўкі спартсменаў, сур'ёзна палепшана інфраструктура. Але нязменным застаўся напружаны трэніровачны рэжым, сур'ёзны падыход да вучобы, накіраванасць на вынік усіх, хто мае дачыненне да вучылішча. Нездарма **дырэктар Рэспубліканскага вучылішча алімпійскага рэзерву Уладзімір ЛЯВОНАЎ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт,** называе сваю ўстанову «беларускім манастыром Шаалінь».

«Я знаёмы з сістэмай навучання ў Кітаі. І магу ўпэўнена сцвярджаць, што РДВАР — гэта беларускі Шаалінь з некаторымі адрозненнямі. У нас сістэма створана не на выжыванне, а на стварэнне аптымальных, камфортных умоў для спартыўнай падрыхтоўкі. Калі ў кітайскім Шаалінь развіваюцца два-тры віды баявых адзінаборстваў, то ў беларускім — 25», — адзначае ён.

Лёгка тут не бывае

Рэспубліканскае вучылішча алімпійскага рэзерву — цэнтр сістэмы алімпійскай падрыхтоўкі. Такія ж вучылішчы працуюць у кожным рэгіёне і буйных гарадах. «Гэта вялізны механізм, які рухае больш за тры тысячы маладых спартсменаў. Гэта не проста маладыя спартсмены, гэта ўжо атлеты, блізкія да прафесійнага ўзроўню, якія ўжо паспелі сябе праявіць і працуюць на зусім іншым узроўні спартыўнай падрыхтоўкі. Гэты ўзровень адрозніваецца па многіх паказчыках. У першую чаргу, сістэмнасцю работы», — адзначае Уладзімір Лявонаў. У рэспубліканскім вучылішчы сёння рыхтуюцца 600 спартсменаў. За іх фізічнае развіццё адказваюць 55 трэнераў, за інтэлектуальнае — 39 настаўнікаў. Простая арыфметыка — на двух навучэнцаў даводзіцца прыкладна па два супрацоўнікі вучылішча. Падыход вельмі сур'ёзны, але і патрабаванні высокія, як у Шааліню. Што ў Шаалінь, што ў РДВАР ідуць, разумеючы, што лёгка не будзе. Гэта становіцца зразумела ўжо на этапе адбору і паступлення ў вучылішча.

«Кітайскі Шаалінь — унікальны. І наш беларускі таксама. Сакрэт яго ўнікальнасці — у нашых навучэнцах. Адпаведнага жадання траіць сюды недастаткова, трэба з самага пачатку даказаць, што ты гэтага варты», — адзначае Уладзімір Уладзіміравіч. Шматэтапную сістэму адбору ў вучылішча ён называе аб'ектыўнай, празрыстай і эфектыўнай. Талент заўсёды выдзяляецца, а спартыўныя спецыялісты, якіх у краіне багата, абавязкова яго заўважаць. Калі года на яго будзе звернута пільная ўвага трэнераў вучылішча алімпійскага рэзерву, спецыялістаў з федэрацый па відах спорту. Пасля таго юны талент запросяць на аглядавыя зборы ў вучылішча: спартсмен знаёміцца з умовамі, у якіх, магчыма, яму прыйдзецца жыць, здае нарматывы. «Усе нашы абітурыенты здаюць нарматывы па агульнай і спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы. Нярэдка здараюцца парадаксальныя сітуацыі. Дзіця можа быць таленавітым, і гэта з першага погляду відаць, і спартыўныя вынікі паказвае, але з агульнай фізічнай падрыхтоўкай могуць быць праблемы, напрыклад, не самы высокі ўзровень развіцця сілы, хуткасці. Паколькі да кожнага мы падыходзім індывідуальна, то можам на такі нюанс закрыць вочы, бо для нас галоўнае — спецыяльная фізічная падрыхтоўка, спартыўны талент. Агульную падрыхтоўку нашы трэнеры падцягнуць хутка», — адзначае Уладзімір Уладзіміравіч. І толькі пасля аглядавых збораў прымаецца рашэнне аб залічэнні ў вучылішча. Важна, што вырашаецца спартыўны лёс калегіяльна: спецыялістамі федэрацыі па відах спорту, Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі (гэта вяршыня айсберга спартыўнай падрыхтоўкі) і адміністрацыяй вучылішча.



Не прымушаць, а падтрымліваць

Дзяцінства ў спартсменаў заканчваецца хутка, у вучылішча алімпійскага рэзерву яны паступаюць у 12-13 гадоў. Таму спартыўнікам вучылішча прыходзіцца быць і за трэнераў, і за выхавацеляў, і часам за бацькоў, якія бачаць сваіх крывінак не так часта. Тут фарміруецца і спартыўнае братэрства — на базе РДВАР сфарміравана і рыхтуецца да важных стартаў 14 юнацкіх (кадэцкіх) камандаў па гульнявых відах спорту.

«Вельмі важна не ўпусціць спартсмена ў 13-14 гадоў. У гэтым узросце яны праходзяць вельмі сур'ёзную школу падрыхтоўкі, прывыкаюць да дысцыпліны. Пачынаюць задумвацца над будучыняй, усведамляюць, што хочуць рэалізаваць сябе як спартсмены альбо лепш абраць нешта іншае. Графік у каманды сур'ёзны: па дзве трэніроўкі на дзень, яшчэ трэба вучыцца ў школе. Але кожны разумее, дзеля чаго тое трэба. Яны ўсе з'ехалі з дому, ахвяравалі сваім дзяцінствам, адмовіліся ад гурткоў, дзіцячых забаў. Нягледзячы на ўзрост, гэта дарослыя людзі», — адзначае **Аляксей СЯЛЕНЯ, старшы трэнер мужчынскай каманды па баскетболе U-14,** якая дзейнічае на базе РДВАР. Так пра сваіх спартсменаў можа сказаць кожны трэнер вучылішча. Паступіць мала, трэба ўвесь час даказваць сваё права вучыцца ў беларускім Шааліню. «Двойчы на год у нас праводзіцца атэстацыя спартсменаў: напярэдняя ў канцы зімы і выніковая ў канцы навучальнага года. Гэта сур'ёзны іспыт для навучэнца, бо дэталёва разглядаецца работа і вынікі кожнага. Аналізуем паспяховасць, паводзіны, стан здароўя і, вядома, спартыўны вынік. Калі па нейкім крытэрыі ёсць сур'ёзныя праблемы — як бы ні было цяжка, даводзіцца развітвацца. Адзначу, што на папярэдняй атэстацыі мы пытанне аб адлічэнні не ставім. Мы бачым агульную карціну і даём спартсмену шанц выправіць свае прабелы. Звычайна гэты час супадае з важнымі стартамі, таму навучэнцам даводзіцца нялёгка, але што дзеля лёгка, ім нікто і не абяцаў», — расказвае Уладзімір Уладзіміравіч.

Сумяшчаць дзве спартыўныя трэніроўкі на дзень і вучобу ў школе сапраўды нялёгка. Тыповы распарадак дня навучэнцаў РДВАР можа ўразіць нават дарослага чалавека. Ранні пад'ём, першы лёгкі сняданак, пасля якога першая трэніроўка, затым другі сняданак, урокі, другая трэніроўка і падрыхтоўка дамашняга задання. Некаторым відам спорту пашанцавала больш, іх прадстаўнікі трэніруюцца ў самім вучылішчы, а некаторым, напрыклад, па плаванні, мастацкай гімнастыцы, фігурным катанні, прыходзіцца ездзіць на гарадскія базы. «Нашы навучэнцы вельмі рана выраслі, але ўсё роўна яны застаюцца дзецьмі і наша задача рабіць так, каб ім было камфортна і зручна развівацца. Тут не трэба нікога прымушаць працаваць, іх матываванасць відаць няўзброеным вокам. Іх трэба толькі падтрымліваць», — адзначае дырэктар РДВАР.

Такі напружаны графік тут быў з самага пачатку. Вось як пра свае гады ў вучылішчы ўспамінала першая выпускніца, **алімпійская чэмпіёнка Антаніна КОШАЛЬ:** «Я рада, што лёс прывёў мяне ў тады яшчэ спартыўны інтэрнат і я стала займацца сваёй любімай справай пад кіраўніцтвам трэнера Віктара Сяргеевіча Хамутова. Так, было вельмі цяжка, але было і цікава. Самае галоўнае, што нашы настаўнікі разумелі, як складана дзецям вытрымліваць па дзве трэніроўкі, і нас падтрымлівалі. Былі моманты, калі мы да позняга вечара трэніраваліся і вячэру нам пакідалі ў сталоўцы. А што там заставалася — ледзяны тварог. Дык пасля такой вячэры яшчэ трэба было ісці ў класы і выконваць дамашняе заданне, нярэдка мы ў тых класах і засыналі ад стомленасці. Добра, што вучобы і спальны корпусы побач — некалькі разоў дзяжурныя выхавальнікі аднаслі мяне ў ложак. Але мы не скардзіліся».

РДВАР дае адукацыю агульнага сярэдняга ўзроўню і сярэдняга спецыяльнага ўзроўню з падрыхтоўкай спецыялістаў па спецыяльнасці «Спартыўна-педагагічная дзейнасць» з кваліфікацыяй «трэнер па відзе спорту». Нягледзячы на шчыльны трэніровачны графік, навучанню таксама ўдзяляецца шмат увагі. «Класічная педагагічная сістэма пабудавана на прынцыпе «пустой пасудзіны» — успрымай вучня як пустую пасудзіну, якую трэба напаўняць. Усходняя сістэма пабудавана на прынцыпе факела — педагог павінен вучня запаліць, і той будзе гарэць. Дык вось, нашы навучэнцы — факелы, яны ўсе гараць. Яны матываваныя, яны разумеюць, якія намаганні ў іх укладаюць якія трэнеры, настаўнікі. Іх не трэба пераконваць або прымушаць, у тым ліку і вучыцца. Урокі замежнай мовы яны не прапускаюць ні на якой падставе. Таму што многія былі за мяжой і яны сябе бачаць спартсменамі высокага класа і разумеюць, што ім жыццёва неабходная замежная мова», — адзначае Уладзімір Уладзіміравіч. У РДВАР не спартсмен падладжваецца пад расклад вучэбных заняткаў, а расклад складаюць пад яго з улікам графіка трэніровак. На дзень — прыкладна па чатыры-пяць урокаў, на якіх прысутнічаюць па чатыры-пяць вучняў. Амаль індывідуальныя заняткі, якія дазваляюць бацькам сэканоміць на рэпетытарах. На карысць навучэнцам працуе і магчымасць дыстанцыйнага навучання. Хоць тут як пагляндзець: больш адсутнасць у вучылішчы не з'яўляецца ўважлівай прычынай для пропуску заняткаў. Але калі сур'ёзна, то па словах дырэктара, настаўнікі разумеюць, што працуюць з незвычайнымі вучнямі. Яны прысутнічаюць на трэніроўках і бачаць, які аб'ём работы выконваюць іх падапечныя.

Роўны навучае роўнага

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і напружаны лад жыцця, выпускнікі вучылішча ўспамінаюць сваю alma mater з цеплынёй. Пасля распаду СССР спартыўны інтэрнат знаходзіўся ў вельмі цяжкім становішчы: спартсменам даводзілася літаральна галадаць, многія трэнеры сышлі. Сёння гэта беспрэцэдэнтна, а тады навучэнцы хадзілі разгружаць вагоны, каб зарабіць якую капейку. «Маладыя людзі заўсёды шукаюць сабе дадатковы заробак. Усе хацелі зарабляць. Па суботах, нягледзячы на страх, мы спускаліся па пажарнай лесвіцы і ішлі на найбліжэйшую чыгуначную станцыю. Ноч працавалі, разгружалі цыбулю, разынкі, шакалад, шчэбень — што заўгодна. А потым сядзелі і перажывалі за разлік. Час быў нялёгкі. Нават у злітнай установе, якой быў спартыўны інтэрнат, не хапала харчавання. У асноўным нам давалі рыбу, маглі даць кавалак мяса, які можна было жаваць суткі, як жуйку. Здаровага, спартыўнага харчавання, пра якое сёння ўсе гаворыць, у нас і не было», — расказвае **алімпійскі чэмпіён па гандболе Андрэй БАРБАШЫНСКІ.** Проста зафіксуем для гісторыі — алімпійскі чэмпіён разгружае вагоны. Сёння ў вучылішчы алімпійскага рэзерву вучыцца Барбашынскі-малодшы. Захар не пайшоў па шляху бацькі і абраў баскетбол. Андрэй Станіслававіч падкрэслівае, што цяпер у сына і яго таварышаў нярозны перыяд — трэба пацвердзіць сваё ўменне і жаданне займацца спортам, максімальна праявіць сябе. Гэта нясправядліва, але магчыма. Тым больш што сёння для гэтага ў вучылішчы створаны ўсе ўмовы.

Навучэнцам больш не трэба разгружаць вагоны і хадзіць галодныя — кваліфікаваныя кухары кожны дзень гатуюць ім смачную карысную ежу. У рацыёне — абавязкова агародніна, фрукты — усё, што неабходна маладому арганізму. Каб маладыя людзі добра сябе адчувалі, працуюць урачы з медыцынскай часці, якая ўяўляе з сябе міні-паліклініку. Жыве сучасны алімпійскі рэзерв у камфортных светлых пакоях, дзе можна спакойна выспацца. Разнастайныя эмоцыйныя пытанні дапамагае вырашыць выхавальнік. Зразумела, што для плённай падрыхтоўкі неабходна і якасная інфраструктура. Рэспубліканскае вучылішча алімпійскага рэзерву — гэта невялікі спартыўны горад у горадзе. У 2001 годзе быў пабудаваны новы інтэрнат. У 2006-м адкрыліся залы сілавой падрыхтоўкі, камп'ютарныя класы і лабараторыя інфармацыйных тэхналогій. У 2012 годзе ўведзены ў эксплуатацыю новы інтэрнат, была абсталявана веласіпедная база. 2018 год падарыў вучэльні спартыўны комплекс для гульнявых відаў спорту. У гэтым комплексе часта праводзяцца гарадскія і рэспубліканскія спаборніцтвы. А ў жніўні 2023 года ён прыме спаборніцтвы па валейболе ў рамках II Гульняў краін СНД. Яшчэ адно адроснене беларуская Шаалінь ад кітайскага — па беларускай эвакуыцы тут адкрыты і рады ўсім. Таму прыняць удзельнікаў II Гульняў краін СНД тут будуць рады. У 2021 годзе быў рэканструяваны стадыён з футбольным полем, лёгкаатлетычнай дарожкай, пляцоўкай для пляжнага валейбола, сектарамі для скачкоў у даўжыню і штурхання ядра, трыбунамі. Не паспеў сысці снег — на стадыёне закіпела жыццё.

Кожны спартсмен, які скончыў вучылішча алімпійскага рэзерву, пацвердзіць, што гэта не проста навучальная ці спартыўная ўстанова, а сапраўдная сям'я. Пра гэта сведчыць і тое, што чэмпіёны аддаюць сюды і сваіх дзяцей. Акрама алімпійскага нашчадка Захара Барбашынскага, тут вучыцца і Іван Багданові, сын алімпійскага чэмпіёна 2008 года па веславанні на байдарках і каноэ Аляксандра Багдановіча. І такая сямейнасць — яшчэ адна традыцыя РДВАР. Па словах Уладзіміра Лявонава, гэта асноўная нагода для гонару: «Я ганарыся, што ў мяне атрымліваецца выбудаваць родныя, але нясправядліва выбудаваць родныя адносіны з вучнямі і трэнерамі. Я лічу, што тут не павінна быць ніякіх адносін з вышэйшы. У педагогікі ёсць паняцце — роўны навучае роўнага. У нашай установе ўсе жывуць у рэжыме 24 на 7, усе жывуць адной сям'ёй і жывуць як роўныя. Я ўпэўнены, што вучні не павінны баяцца дырэктара, таму ў кожную вольную хвіліну я імкнуся прыйсці на трэніроўку, бо мне цікава паглядзець, як яны жывуць. Я стараюся ўцягнуць настаўнікаў у трэніровачны працэс, каб яны бачылі, пасля якіх нагрузак да іх прыйшоў вучань на заняткі. Кожны стараецца зразумець адзін аднаго і ад гэтага будаваць сваю работу. Не скажу, што ўсё ідэальна атрымліваецца. Але як належыць людзям спорту, мы ўвесь час удасканальваемся».

Спорт-тайм

Юлія Апанасовіч — бронзавы прызёр чэмпіянату свету па боксе

У традыцыйным аглядзе «Звязды» — самыя цікавыя спартыўныя навіны

ТУРНІР ТЫДНЯ. У сталіцы Індыі Нью-Дэлі прайшоў 13-ы чэмпіянат свету па боксе сярод жанчын з удзелам беларускіх спартсменак. Бронзавым прызёрам чэмпіянату стала беларуска Юлія Апанасовіч, якая выступае ў катэгорыі да 52 кілаграмаў. За выхад у фінал яна білася з кітаянкай Ву Ю. Паколькі пайдынкі за трэцяе месца не праводзяцца, беларуска стала бронзавым прызёрам. Усяго ўдзел у галоўных спаборніцтвах сезона для жанчын прынялі больш за 300 спартсменак з 65 краін. Акрамя Юліі Апанасовіч, Беларусь прадстаўлялі яшчэ пяць спартсменак. Вікторыя Кебікава дайшла да чвэрцьфіналу ў вагавой катэгорыі да 81 кг, на стадыі адной восьмай фіналу барацьбу за медалі завяршылі Ала Івашкевіч (да 60 кг) і Аліна Вебер (да 75 кг). Яна Бурым (да 50 кг) і Арына Данільчык (да 66 кг) не прайшлі далей першага раўнда.

ГЕРОІ ТЫДНЯ. Беларусы выступілі на адкрытым чэмпіянаце Расіі па лыжных гонках і біятлоне сярод асоб з паражэннем апорна-рухальнага апарату. Спартсмены разыгрывалі медалі ў шасці дысцыплінах (па тры ў лыжных гонках і біятлоне). У актыве беларускай каманды пяць узнагарод: тры залатыя і дзве сярэбраныя. Усе тры залатыя медалі ў класе сядзячых інвалідаў-калясачнікаў заваявала Валянціна Шыц. Ёй не было роўных на дыстанцыях 2,5 км, 10 км і ў спрынце. Двойчы на п'едэстал падымалася Лідзія Лобан: яна фінішавала другой у лыжным спрынце і выйграла «серабро» біятлоннай індывідуальнай гонкі на 12,5 км.

МЕДАЛІ ТЫДНЯ. У Рэспубліцы Адыгея завяршыліся ўсерасійскія спаборніцтвы па веласіпедным спорце на шашы сярод жанчын і юніёрак з удзелам беларускіх спартсменак. Пераможцай на дыстанцыі 100 кіламетраў стала беларуска Ганна Церах, яшчэ адна беларуская спартсменка Ірына Чуянкова прыехала да фінішу другой. На выніках гонкі на 120 км увесь п'едэстал аказаўся беларускі: на першым месцы — Анастасія Кіпцікава, на другім — Кацярына Русак, на трэцім — Ганна Церах.

ЛІЧБА ТЫДНЯ. 11 медалёў заваявалі беларусы на міжнародных спаборніцтвах «Кубак заснавальнікаў самба» ў Маскве. Сярэбраныя медалі атрымалі Анжэла Жылінская (да 72 кг) і Карына Шут (да 80 кг). Бронзавымі прызёрамі турніру сталі Анфіса Капаева (да 50 кг), Яна Беганская (да 59 кг), Анастасія Скварцова (да 65 кг), Данізла Ждан (да 65 кг) і Валерыя Хрушчова (звыш 80 кг), а таксама Аляксандр Круглік (да 88 кг), Сяргей Лесяк (да 98 кг), Ілья Жупікаў (звыш 98 кг) і Валянцін Наталевіч (бавявое самба, звыш 98 кг).

ПОСПЕХ ТЫДНЯ. У канькабежным цэнтры «Каломна» скончыўся XIII Усерасійскі турнір па канькабежным спорце «Каломенскі лёд». Па выніках двух дзён спаборніцтваў беларуская каманда заваявала восем узнагарод. Пераможцай турніру на дыстанцыі 500 метраў стала Ганна Дамарацкая, на другім месцы — Кацярына Слоева. У мужчынскім заездзе на гэтай дыстанцыі ўвесь п'едэстал занялі беларусы: Ігнат Галавацюк — першы, Уладзіслаў Гапон — другі, Віктар Рудзянка — трэці. Ігнат Галавацюк заваяваў «серабро» на дыстанцыі 1500 метраў, а «золата» дасталася Ягору Дамарацкаму. У жаночым забегу на 1500 м беларуска Яўгенія Вараб'ёва стала сярэбраным прызёрам.

НЯЎДАЧА ТЫДНЯ. Нацыянальная зборная Беларусі па футболе пачала выступленне ў адборачным турніры чэмпіянату Еўропы 2024 года. Першым сапернікам беларусаў у кваліфікацыі стала зборная Швейцарыі. Сустрэча прайшла ў сербскім горадзе Нові-Садзе. Вынік супрацьстаяння Беларусь — Швейцарыя — 0:5. Гэта адно з найбуйнейшых паражэнняў зборнай Беларусі ў яе гісторыі. Другі матч беларускіх футбалістаў у адборы на Еўра-2024 пройдзе 28 сакавіка ў Бухарэсце і стартуе ў 21.45 па мінскім часе.

Адборачны турнір чэмпіянату Еўропы па футболе завершыцца ў ліставадзе, пуцёўкі ў фінальную стадыю кантынентальнага першынства атрымаюць па дзве найлепшыя каманды з усіх дзесяці кваліфікацыйных груп.

«Некаторыя сапернікі ад маёй гульні стагналі»

Першая алімпійская чэмпіёнка беларускага баскетбола 1980 года Таццяна Белашапка святкуе юбілей

З днём нараджэння легендарную спартсменку павіншавалі прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар Лукашэнка. Прэзідэнт НАК Беларусі адзначыў, што на працягу ўсёй кар'еры прафесійнага спартсмена і пасля завяршэння актыўных выступленняў у складзе мінскага «Гарызонта» ў зборнай СССР Белашапка заставалася ў баскетболе і прысвяціла сябе выхаванню новага пакалення гульцоў, папулярызацыі любімай гульні. «Вашы перамогі і ўзнагароды на Алімпійскіх гульнях, чэмпіянатах свету і Еўропы застаюцца непераўзыдзенымі дасягненнямі ў айчыннім баскетболе і служаць прыкладам для юных атлетаў», — гаворыцца ў віншаванні. Віктар Лукашэнка пажадаў Таццяне Белашапцы добрага здароўя, шчасця, кахання і дабрабыту.

Юбілей — нагода ўспомніць выдатную кар'еру баскетбалісткі. Расказваем самыя цікавыя факты пра Таццяну Белашапку. Свае спартыўную кар'еру яна магла пабудаваць у гімнастыцы, але трэнер паглядзеў на тоненькую дойгую дзяўчынку і сказаў: «Набор завершаны». Затым з'явіўся шанц знайсці сябе ў плаванні, трэнер нават паабяцаў, што быць Таццяне алімпійскай чэмпіёнкай. Але пастаянныя ангіны і атыты прымусілі пакінуць басейн. Таццяна Міхайлаўна выбрала ў баскетбольнай сям'і — гэтым відам спорту займаліся старэйшыя брат і сястра. Выбар быў зроблены.

Ва ўсім першая

У 1973 годзе на Спартакіядзе школьнікаў СССР у Вільнюсе зборная каманда дзяўчат БССР заняла трэцяе месца. У складзе той каманды была і Таццяна Івінская (Белашапка) яна стала пасля замужжа). Пасля гэтага 15-гадовую баскетбалістку запрасілі ў юніёрскую зборную СССР, з якой яна паехала на чэмпіянат Еўропы. Яго савецкая каманда выйграла! У 15 гадоў Таццяна Івінская стала чэмпіёнкай Еўропы сярод юніёрак, і ёй было прысвоена званне «Майстар спорту Савецкага Саюза». Да яе ніводнай беларускай баскетбалістцы ў 15 гадоў гэтага звання не прысвойвалі.

У тым жы лёсавызначальным 1973 годзе Таццяну Івінскую запрасілі ў мінскую каманду «Гарызонт», якую ўзначальваў легендарны трэнер Сямён Халінскі. «Чэмпіянат Савецкага Саюза ігралі тры разы: вялікі тур з шасці гульняў і малы тур з пяці гульняў. Пасля аднаго тура прыязджаем дадому па-вар'яцку стомленай. Момантамі было вельмі цяжка, але лёгка нідзе не бывае. Баскетбол сярод гульняў вых відаў спорту — лідар па траўматызме. Гэта кантактная гульня, і не ўсе рухі спаперніка можна кантраляваць. Траўмы могуць быць вельмі сур'ёзныя. У 1975 годзе, падчас падрыхтоўкі да юніёрскага чэмпіянату Еўропы, на зборах у Сухумі атрымала траўму — разарваўся меніск. Ад болю страцілі прытомнасць. Замест чэмпіянату Еўропы адправілася на аперацыйны стол. Аперыруюць меніск на сагнутай назе. І калі мяне падобным чынам размясцілі на аперацыйным стале, хірург не даставаў да калена. Але не разгубіўся — стаў на зэдлік. І праз 10 гадоў падчас чэмпіянату свету ў мінскім Палацы спорту да мяне падыходзіць невысокі мужчына: «Таня, добры дзень! Гэта я табе рабіў аперацыю». Аказалася, ён яе запомніў надоўга», — успамінае Таццяна Міхайлаўна.

У 1977 годзе Таццяна Івінская другі раз стала чэмпіёнкай Еўропы сярод юніёрак. Галоўны трэнер зборнай СССР Лідзія Алякоева пранавала павысіць свой узровень у камандзе Вышэйшай лігі. Таццяна выбрала ленінградскі «Спартак», дзе атрымала выдатны досвед гульні ў асноўным складзе каманды, якая займала чацвёртае месца ў чэмпіянаце СССР. Але праз два гады вярнулася ў родны «Гарызонт». Вясной 1980 года «Гарызонт» у чэмпіянаце СССР з першай лігі падняўся ў вышэйшую.

А летам 1980-га беларуская баскетбалістка дасягнула галоўнай спартыўнай мэты — стала алімпійскай чэмпіёнкай. «На самых Гульнях я перажывала, што мала гуляю. Хацелася б больш выходзіць на пляцоўку. Калі ў складзе зборнай выходзіш на пляцоўку «Лужнікоў» і за цябе хварэюць тысячы людзей — эмоцыі зашкальваюць», — дзеліцца чэмпіёнка.

«Больш за ўсё ганарыся сваімі дзецьмі»

Літаральна праз тыдзень Таццяна выйшла замуж. Хутка даведалася, што цяжарная. Сыну было пяць месяцаў, калі яна вярнулася да трэніровак. Сезон 1981/1982 гадоў мінская каманда «Гарызонт» правяла ў першай лізе чэмпіянату СССР. У 1982 годзе вярнулася ў Вышэйшую лігу. І дабралася да чацвёртага месца ў чэмпіянаце СССР. Гэта быў суперузровень. У вышэйшай лізе «Гарызонт» гуляў да 1987 года.

У фінале чэмпіянату свету 1983 года зборная СССР з Таццянай Белашапкай у саставе абыграла амерыканскіх саперніц. «З-за таго, што іх не было на Алімпіядзе-80, гэтая перамога была ўдвая значная. Амерыканкі да таго часу ўжо гулялі ў іншы баскетбол, больш за мужчынскі. А ў нас яшчэ быў класічны. Асабіста я гуляла ў жорсткі баскетбол, некаторыя гульцы ад маёй гульні стагналі. Мне заўсёды ў камандзе саперніка давалі самага складанага гульца», — расказвае Таццяна Міхайлаўна.

У 1987 годзе з нараджэннем другога сына Таццяна Белашапка скончыла актыўную спартыўную кар'еру. Працавала трэнерам, выкладала ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. І сёння яе можна сустрэць на баскетбольных спаборніцтвах у якасці суддзі. Да жанчыны гэта самае галоўнае ў жыцці».

Матэрыялы паласы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

ЯРКІЯ ФАРБЫ КНІЖНАГА КІРМАШУ

Цікавыя гісторыі на літаратурным стартапе LitUP

У суботу на выстаўцы-кірмашы прайшоў фінал рэспубліканскага літаратурнага стартапу LitUP. Сёлета ў конкурсе ўдзельнічала каля 200 аўтараў, якія жадаюць, каб іх рукапісы сталі кнігамі. З іх было выбрана 20 фіналістаў, яны і прэзентавалі свае творы на кніжнай выстаўцы.

Значнасць мерапрыемства для аўтараў азначыў **намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ:**

— Тое, што вы зрабілі, той шлях, які трэба было прайсці, — гэта складаны кавалак работы. Можна было звярнуцца ў выдавецтва, атрымаць адказ «так» або «не» і сысці. А прапрацаваць усе этапы конкурсу — гэта поўнае напружанне. Вельмі хацелася б, каб яна ўвянчалася поспехам.

Аб сваіх творах, прадстаўленых на конкурс, расказвалі як вопытныя пісьменнікі, так і аўтары-пачаткоўцы. Цікава, што вядучымі мерапрыемства былі зусім не выпадковыя людзі. Год таму яны таксама з'яўляліся ўдзельнікамі стартапу, таму зусім не па чутках ведалі пра тое, што адчуваюць аўтары.

Сярод удзельніцаў стартапу былі і аўтары Выдавецкага дома «Звязда», да таго ж яны сталі пераможцамі. Напрыклад, Валянціна Быстрымовіч расказала аб свайго будучай кнізе «Малако аднарога». Гэта твор для падлеткаў. Галоўныя гераіні — дзве дзяўчынкі: Янка Булкіна і Галка, якія жывуць на ўскрайку Магілёва. На словах аўтара, яны вясёлыя, добрыя, але вельмі любяць усялякія прыгоды. Кніга пачынаецца з таго, што жыццё дзяўчынак мяняецца з прыходам у школу новага настаўніка французскай мовы. Іх папярэдняя настаўніца дапрацоўвала апошні год перад пенсіяй, таму клас ведаў мову слаба — яна проста так ставіла ўсім дазвалі, і школьнікі былі задаволеныя. Але новы настаўнік зусім іншага ўзроўню. Калі ён зразумеў, што ніхто ў класе не ведае французскай мовы, ён не ўпаў у адчай, а падышоў да сітуацыі творча. Пачаў расказваць фантастычныя гісторыі пра сябе. Спачатку на рускай. Потым — на рускай і французскай. У выніку да канца года клас ужо нядрэнна размаўляў на французскай мове. Валянціна Быстрымовіч адзначыла, што раздзелы ў кнізе ёсць розныя. Часам мы смяёмся разам з дзяўчынкамі, часам ёсць моманты вельмі напружаныя, калі мы баімся за іх.

Пасля прэзентацыі аўтары атрымалі свае ўзнагароды. Нагадаем, што пераможцам дастаецца прыярытэтнае права на выданне сваёй кнігі ў выдавецтвах Беларусі тыражом да тысячы экземпляраў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

10+10 = натхненне

Згадзіцеся, малады талент вельмі нагадвае веснавую кветку, у якой і юная сіла, і датклівасць, і надзея... Недарэмна ав'яўлены ў 2016 годзе Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» і выдавецтвам «Мастацкая літаратура» міжнародны літаратурны конкурс на найлепшы твор сярод маладых аўтараў быў названы «Першацвет». Кожны год па выніках конкурсу выдаецца альманах пад такой жа назвай, у якім публікуюцца творы дзесяці найлепшых маладых паэтаў і дзесяці найлепшых маладых празаікаў ва ўзросце да 35 гадоў. І вось падведзены вынікі шостага конкурсу, выдадзены чарговы альманах. Узнагароджанне лаўрэатаў адбылося на чацвёрты дзень работы XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Першая частка цырымоніі была прысвечана 70-годдзю часопіса «Маладосць», якое будзе адзначацца ў красавіку. У гэтым выданні друкавалася ці яшчэ будуць друкавацца ўсе лаўрэаты «Першацвета», а галоўны рэдактар Вольга Рацэвіч з'яўляецца адным з сяброў журы конкурсу.

Сярод лаўрэатаў «Першацвета» аказаліся прадстаўнікі розных прафесій, жыхары розных рэгіёнаў, і не толькі з Беларусі. Напрыклад, Дзмітрый Аўчыннікаў, які, на жаль, не змог прыехаць на ўручэнне, — юрыст, працуе ў Арбітражным судзе Новасібірскай вобласці, але апавяданні свае піша на беларускай мове. Алесь Бараноўскі — кандыдат філалагічных навук, супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а Ягор Жукоўскі — аспірант кафедры «Аўтамабільныя дарогі» Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Аляксандра Кароль — гісторык, працуе ж бібліятэкарам Брэсцкай пагранічнай групы. Самая маладая лаўрэатка, Маргарыта Ядзевіч, вучыцца ў 8-м класе СШ № 194 г. Мінска, яна даслала на конкурс сваю прозу. Журналістка Вольга Міхаленка, якая перамагла са сваімі вершамі, яшчэ і маладая мама, яна прыйшла на цырымонію ўручэння з маленькім дзіцем. А выпускнік гістарычнага факультэта БДУ Іван Мельнікаў, які друкуецца пад псеўданімам Іван Мелаў, з'явіўся ў вайсковай форме — цяпер ён праходзіць службу ў арміі.

Дыпломы ўручалі намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Віктар Шніп і галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Вольга Рацэвіч.

Віктар Шніп такім чынам пракаментаваў вынікі конкурсу для чытачоў «Звязды»:

— Хто запомніўся з канкурсантаў?

— Усе дваццаць чалавек адметныя, кожны па-свойму. Яны смелыя, ініцыятыўныя. Напрыклад, Алесь Гоман, першакурснік юрфака БДУ, прыехаў вучыцца ў Мінск з Гродна, і першае, што зрабіў — пачаў шукаць знакавыя мясціны, захацеў даведацца, дзе пахаваны Янка Купала і Якуб Колас. Вось такая ў нас сёння моладзь... У іх ёсць адчуванне, што яны жывуць у свабоднай краіне, на свабоднай зямлі, і яны хочуць яе спазнаваць, далучацца да яе культурнага працэсу. Многія маюць ужо перамогі ў іншых літаратурных конкурсах, а Андрэй Кімбар, ведаю, мае ўжо і рукапіс уласнай кнігі.

— Сярод маладых традыцыйна больш паэтаў, чым празаікаў... Гэта не змяшчаецца?

— Не. Больш пішуць, вядома, паэзіі. Многія ж празаікі ва ўсе часы пачыналі з вершаў. Праўда, сённяшнія пачаткоўцы бяруцца часта адразу за ўсё: і за вершы, і за прозу, і за п'есы. І не лічаць абавязковым прытрымлівацца класічных формаў, эксперыментуюць. Сёння шмат магчымасцяў займацца самаадукацыяй, затое многія пачаткоўцы пазбаўленыя магчымасці мець свайго рэдактара, старэйшага пісьменніка, які б нешта раіў.

— Ці ўплывае перамога ў конкурсе на літаратурны лёс лаўрэатаў?

— Вядома. Гэта выдатная матывацыя. Усе, хто перамагаў у ранейшыя гады, працягваюць пісаць, друкавацца. Некаторыя ўжо прынятыя ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Пасля перамогі ў конкурсе ў Станіславы Умец і Маргарыты Латышкевіч у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў серыі «Час XXI» выйшлі першыя кнігі прозы, за якія аўтары атрымалі Нацыянальную літаратурную прэмію ў намінацыі «Дэбют». Важна і тое, што ў складзе журы «Першацвета». Яго ўзначальвае дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч, у складзе — дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», ён жа старшыня секцыі прозы СПБ Алесь Бадак, я, акрамя сваіх рэдактарскіх пасад,— старшыня секцыі паэзіі СПБ, Аляксей Чарота, галоўны рэдактар «ЛіМа» — старшыня прыёмнай камісіі СПБ, Вольга Рацэвіч — галоўны рэдактар «Маладосці»... Гэта значыць, у журы людзі, якія могуць рэальна падтрымаць малады талент.

На выстаўцы можна было набыць альманах «Першацвет» з творамі лаўрэатаў, узяць аўтографы, чым многія і скарысталіся.

Фінальны акорд

І вось ён, апошні дзень работы юбілейнай XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Якім ён выдаўся, якія ўражанні аб выстаўцы ў наведвальнікаў, пісьменнікаў і прадстаўнікоў выдавецтваў? Давайце разам прайдзіцеся паміж яркімі экспазіцыямі, якія вось-вось пачнуць дэманцыравацца.

Увагу прыцягвае дзяўчынка гадоў шасці, якая ўважліва разглядае кнігу з яркімі малюнкамі і чытае ўслых. Заўважыла фатографа — збянтэжылася, але потым набралася духу і працягнула чытаць. Побач стаяла яе мама. Аказалася, яны з дачкой наведваюць кніжную выстаўку штогод, аднак сёлета выбраша атрымалася толькі ў дзень закрыцця. Дзяўчынка вельмі любіць чытаць, ведае шмат вершаў на памяць. Падобна, дарэмна мы бядуем, што ўсе дзеці з-за гаджэтаў адвыклі ад кнігі.

На стэндзе Выдавецкага дома «Звязда» — аўтограф-сесія пісьменніка Паўла Гушынца.

— Я шосты год удзельнічаю ў выстаўцы-кірмашы, увесь час на стэндзе «Звязды». Выстаўка — магчымасць абмяняцца досведам, падглядзець нешта ў суседзяў, зрабіць лепш, чым суседзі. Гэта магчымасць пагутарыць ужывую з чытачом, даведацца яго думкі і пажаданні.

Побач сядзела дачка пісьменніка Софія. Менавіта яна натхніла яго на стварэнне дзіцячай кнігі «Дзяўчынка і кракадзіл». Калі Софі было пяць гадоў, Павел пачаў расказваць ёй казкі ўласнага складання.

Нельга абмінуць і міжнародны складнік выстаўкі... Вядома, асабліва аб'ёмныя і разнастайныя экспазіцыі ганаровага госця — Расіі. Але і іншыя краіны спынялі наведвальніка. Стэнд выдавецтва «Усходняя культура» з'яўляецца беларускім прадстаўніцтвам Міжнароднай выдавецкай кампаніі «Шанец», заснаванай у Пекіне ў 2010 годзе. Дырэктар выдавецтва Марына Любарская расказала, што яны ўжо трэці раз удзельнічаюць у выстаўцы. Таксама яна дадала, што сёлета аўдыторыя стала шырэйшая. Раней іх кнігамі цікавіліся ў першую чаргу кітаісты, цяпер жа кнігі кітайскіх аўтараў купляе звычайны чытач.

Цырымонія закрыцця выстаўкі пачалася са слоў намесніка міністра інфармацыі Ігара Бузоўскага:

— Я з задавальненнем магу рэзюмаваць нашу сумесную дзейнасць на працягу гэтых дзён, работу выдаўцоў, пісьменнікаў, людзей, якія чытаюць кнігу. Наша юбілейная XXX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш завяршае сваю работу, і ўцешна адзначыць, што яна адбылася менавіта так, як мы і задумвалі. У няпросты ковідны і геапалітычны час мы сабралі прадстаўнікоў 20 краін.

Выканаўчы дырэктар кніжнай выстаўкі-кірмашу Дзмітрый МАКАРАЎ стаяў каля выткаў дадзенага мерапрыемства:

— Гэта мноra ці мала — 30 гадоў? Ёсць выдавецтвы, якія ўвогуле ніводнай выстаўкі не прапусцілі, — адзначыў ён. — Мы бачым, што за гэтыя гады змянілася ўсё: воннавы выгляд выстаўкі, афармленне, але перш за ўсё змяніліся кнігі.

На яго словах, сёлетняя Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш — рэкардсмен па колькасці наведвальнікаў. Сёлета яе наведала больш за 50 тысяч чалавек.

Пасля найлепшых удзельніцаў выстаўкі ўзнагародзілі ганаровымі граматамі. Сярод іх былі Выдавецкі дом «Звязда» і Саюз пісьменнікаў Беларусі.

Падрыхтавалі Людміла РУБЛЕЎСКАЯ і Лізавета ГОЛАД.

Надвор'е

ВЯСНОВЫ СНЕГАПАД, А ЎНАЧЫ ДА МІНУС 12

Гэта будзе не паўтор вядомага «Хаўера», але ўсё ж...

Аранжавы ўзровень небяспекі з-за снегападу аб'ўлены ў нашай краіне на 28 сакавіка. Спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды лічаць, што такія нечаканыя «затокі» холаду ў першым месяцы вясны яшчэ дапушчальныя, аднак у канцы месяца — гэта ўжо рэдкасць.

У аўторак будзе воблачна, чакаюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу, у многіх раёнах — моцныя ападкі. Месцамі мяцеліца, слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўночны з пераходам на паўночна-заходні 5—10 м/с, парывы да 14 м/с, у многіх раёнах парывы ўзмоцняцца да 15—20 м/с. Максімальная тэмпература паветра прагназуецца ад мінус 2 градусаў да плюс 4 градусаў, а ва ўсходніх раёнах — 5—11 цяпла.

У сераду ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць атмасферныя фронты і халодныя нявызначаныя паветраныя масы, якія паступаюць з поўначы Еўропы. Пахаладае ўжо па ўсёй тэрыторыі краіны. У многіх раёнах Беларусі працягнуць ісці ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, ноччу па ўсходзе з дажджом. Уначы па поўначы месцамі моцны снег, мокры снег, па ўсходзе месцамі галалёд. У асобных раёнах мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Месцамі будзе ўзмацняцца вецер парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да мінус 5 — плюс 1 градуса. Удзень чакаецца мінус 2 — плюс 5 градусаў.

У чацвер наша краіна ў асноўным апынецца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску, толькі ноччу па ўсходзе, а ўдзень пераважна па захадзе Беларусі адаб'ецца ўплыў франтальных раздзелаў. Тамы ўначы ва ўсходніх раёнах будзе кароткачасовы снег, мокры снег. Удзень пераважна па захадзе чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, месцамі слабы галалёд. Ноччу і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 марозу, пры ўмове працяглых прасяненняў магчыма паніжэнне і да мінус 12 градусаў. Днём будзе плюс 1—8 градусаў, а ў заходніх раёнах — 9—11 цяпла.

У пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца кароткачасовыя ападкі (дождж, ноччу з мокрым снегам). Уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра будзе ў межах ад плюс 6 градусаў па паўднёвым захадзе да мінус 5 градусаў па ўсходзе. Удзень — ад плюс 3 градусаў па ўсходзе да плюс 14 градусаў па паўднёвым захадзе.

Паводле папярэдняга прагнозу сіноптыкаў, у выхадныя дні на тэрыторыю нашай краіны пачне паступаць больш цёплая паветраная маса з поўдня, тэмпературны фон павысіцца, а ў ападках пачне пераважаць дождж.

Сяргей КУРКАЧ.

Даты | Падзеі | Людзі

28 САКАВІКА

У краіне

1883 год — нарадзіўся Міхаіл Аркадзевіч Керзін, скульптар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, прафесар.

1913 год — нарадзіўся Аляксей Фядосавіч Іваноў, беларускі вучоны ў галіне дэндралогіі, доктар біялагічных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976).

1923 год — нарадзіўся Элікано Маркавіч Гольдштэйн, заслужаны архітэктар Беларусі. Сярод асноўных работ у Мінску — комплекс жылых дамоў па вуліцы Чырвонай, радыётэхнічны тэхнікум, Дом настаўніка.

1928 год — заснавана Беларускае таварыства сляпых.

1938 год — нарадзіўся Леанід Іванавіч Лазоўскі, беларускі альпініст, майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі, «снежны барс». Адзін з заснавальнікаў альпінізму ў Беларусі. Кандыдат біялагічных навук. Здзейсніў больш за 140 узыходжанняў на вяршыні Каўказа, Паміра, Цянь-Шаня і інш. Неаднаразова падымаўся на найвышэйшыя кропкі Еўропы — Эльбрус і Казбек. Браў удзел у першай беларускай гімалайскай экспедыцыі на Канчанджангу.

У гэты ж год нарадзіўся Сяргей Іванавіч Леановіч, беларускі вучоны ў галіне клінічнай хірургіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны ўрач Беларусі.

1943 год — нарадзілася Валянціна Васільеўна Пражэева, артыстка тэатра лялек, заслужаная артыстка Расійскай Федэрацыі. Працавала ў Смаленскім абласным тэатры лялек, з 1963-га — у Дзяржаўным тэатры лялек Беларусі.

1948 год — нарадзіўся Аляксандр Іванавіч Цыркуноў, беларускі мастак.

1958 год — нарадзіўся Залімхан Анварбегавіч Дундараў, беларускі вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцынскіх навук.

1978 год — Мінскае вытворчае аб'яднанне «Гарызонт» выпусціла пяцімільённы тэлевізар.

У свеце

1483 год — нарадзіўся Рафаэль Санці, вялікі італьянскі жывапісец, графік і архітэктар, прадстаўнік умбрыйскай школы.

1798 год — указам Пятра I у Расіі быў уведзены грамадзянскі шрыфт наўзамен царкоўнаславянскага.

1868 год — нарадзіўся Максім Горкі, рускі пісьменнік і грамадскі дзеяч, ганаровы акадэмік НАН Беларусі. Заснавальнік шэрагу часопісаў, кніжных серый. Адзін з першых падтрымаў беларускую літаратуру, даў высокую ацэнку творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Пераклаў на рускую мову верш Купалы «А хто там ідзе?», цікавіўся беларускім фальклорам. У Беларусі неаднаразова выдаваліся і перакладаліся яго творы.



1933 год — нарадзіўся Аляксандр Навумавіч Міта, расійскі кінарэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР, народны артыст Расійскай Федэрацыі. Зняў фільмы «Тэлефануюць, адчыніце дзверы», «Экіпаж», «Мяжа. Тайговы раман» і інш.

Так гаварылі...

ЦЭЦЫЛІЯ:

«Жыві як можаш, калі нельга як хочацца».

«Дараванне»: пачатак новага праекта

Выдавецтва «Аверсэв» і Саюз пісьменнікаў Беларусі рыхтуюць новы творчы кнігавыдавецкі праект — серыю «Сучасная беларуская літаратура». Мяркуецца, што свет убачаць 12 кніг пад агульным брэндам, які адлюструе шматаблічны характар развіцця беларускай прозы.

У першым томе, які ўбачыў свет напярэдадні XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і носіць назву «Дараванне», змешчаны пяць апавесцяў: «Дараванне» **Алены БРАВЫ,** «Нелюдзі-мы» **Алеся БАДАКА,** «Геній» **Алега ЖДАНА,** «Дзікі луг» **Андрэя ФЕДАРЭНКІ,** «Я цябе бачу» **Анатоля БЕНЗЯРУКА.** Розныя па часе напісання, яны фактычна адлюстроўваюць стан развіцця беларускай літаратуры адносна такога віду, як апавесць.

Ва ўступным артыкуле да зборніка **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** заўважае наступнае: «Проза, як і ўвогуле літаратура, шукае сябе і ў новых жанрах. А мабыць, проста парушае межы традыцыйных жанраў: рамана, аповесці, апавядання, — спрабуе разбурыць традыцыю, каб дасягнуць уяўных вышынь...

У 2022 годзе часопіс «Полымя», некалі галоўны заканадаўца літаратурна-мастацкіх змен, надрукаваў у раздзеле «Проза» 32 творы (прадстаўлены 21 аўтар). Сярод іх — тры раманы, тры аповесці, 22 апавяданні, а таксама «словы пра самога сябе» — такое жанравае вызначэнне ў тэксце **Адама ГЛОБУСА** «Аўтапартрэт з усмешкай», «запісы» — гэта твор «Мой тэлеграм-канал» **Георгія МАРЧУКА,** проза **Вітаўта ЧАРОПКІ** з цыкла «Запісная кніжыца жыцця» — «Мой 2019 год» і «жыццёвінкі» **Васіля ТКАЧОВА** пад назвай «Добра там, дзе мы ёсць»...



Такая вытворча-мастацкая «статыстыка» даволі красамоўна сведчыць, нават пераконвае: з прозай адбываецца нешта асабліваe... Можа, яна не мігрыруе ў іншыя жанры, а зусім памірае, страціўшы цікавасць да сваіх традыцыйных формаў адлюстравання жыцця, стварэння яго мастацкага «фотаздымка»? Смерці прозы, хочацца верыць, ніхто з аўтараў не жадае. Але час пакажа... Абнадзейвае тое, што мы і сёння маем мастацкасць прачытаць новыя творы ў традыцыйным жанры аповесці. У часопісе з аповесцямі выступілі **Генадзь АЎЛАСЕНКА** («Адплата. Амаль дэтэктыўная аповесць у двух эпізодах»), **Віктар КАЗЬКО** (у снежанькоім нумары надрукаваны пачатак аповесці «Высакосны год»), **Яўген ХВАЛЕЙ** («Пяць бэзавых пялёсткаў ільвіцы», або Пандэмія ў Слупцах»). Мяркую, у партфелі часопіса «Полымя» захоўваецца яшчэ не адзін твор у жанры аповесці. А надрукавана, будзем спадзявацца, найлепшае...»

...Аповесць Алены Брава ўпершыню была надрукавана ў часопісе «Маладосць» у 2011 годзе. Пераклад на рускую мову, які выйшаў у часопісе «Сибирские огни», трапіў у дойгі спіс англійскамоўнай літаратурнай прэміі «Ясная поляна» за 2011 год. А ў 2013 годзе ў выдавецкім доме «Звязда» ўбачыла свет кніга на трох мовах (беларускай, рускай і нямецкай) тыражом 1418 экземпляраў (столькі дзён доўжылася Вялікая Айчыннная вайна). У аповесці даследуецца феномен памяці — гістарычнай, асабістай.

А пра сваю аповесць «Я цябе бачу» вось што расказвае сам аўтар — Анатоль Бензярук: «...што я хацеў сказаць гэтым творам... Чытайце... Кажуць, некалі Дыяген хадзіў са свечкай сярод белага дня і шукаў Чалавека. Мінулі тысячагоддзі, а мы па-ранейшаму, як старажытны дзівак-філосаф, шукаем сабе падобных насуперак злым скразнякам, якія штодня імкнуцца затушыць нашыя свечкі. Тры словы: «Я цябе бачу...» — тры лёсы. Дзве жанчыны і адзін мужчына расавядаюць пра жыццёвыя выпрабаванні, якія ім давялося адолець на шляху да шчасця і кахання. Твор прысвечаны сучаснасці і сучаснікам, але распавядае аб спрадвечным пошуку Чалавека сярод касмічнай бязмежнасці».

Праект «Сучасная беларуская літаратура» будзе мець працяг. Да выдання запланаваны зборнікі апавяданняў, жаночай навелы, а таксама асобныя кнігі сучасных празаікаў нашай краіны.

Сяргей ШЫЧКО.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	6.53	19.37	12.44
Віцебск	6.42	19.28	12.46
Магілёў	6.43	19.28	12.45
Гомель	6.41	19.23	12.42
Гродна	7.09	19.52	12.43
Брэст	7.10	19.52	12.42

Месяц

Маладзік 21 сакавіка.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Агапія, Аляксея, Аляксандра, Дзмітрыя, Дзяніса, Міхаіла.*
К. *Анелі, Яны, Аляксандра, Антона, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Жанчына тэлефануе мужу:

— Дарагі, здаецца, у карбюратар вада трапіла...

— Ой, якія мы разумныя сталі, у машынах разбіраемся! Ты хоць ведаеш, дзе карбюратар знаходзіцца?

— У машыне.

— А машына дзе?

— У возеры.

— Сярога, а чаму вы з Машкай расталіся?

— Ды разумееш, яна паўгода ныла на тэму «Ты мяне зусім не кахаеш ...»

— І што?

— Пераканала.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА. ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 10.598. Індэкс 63850. Зак. № 659.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 сакавіка 2023 года.